# Крута ўзьняць тэмпы мабілізацыі сродкаў!

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 232 (4137)
ЧАЦЬВЕР 27 жніўня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА.

## Усе сілы на выкананьне фінпляну трэцяга кварталу

Плян мабілізацыі сродкаў трэцяга кварталу зьяўляецца важнейшым зьвяном усяго народна - гаспадарчага пляну. Ён павінен быць ва што-б там ні стала выкананы, бо ён забясьпечвае пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач капітальнага будаўніцтва па прамысловасьці, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, задач культурнай рэвалюцыі. Недавыкананьне фінпляну паслабляе тэмпы заваяваньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Ход выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў за час з 1 піпеня да 20 жніўня, г. зн. больш чым за палову кварталу, — патрабуе самай сур'ёзнай увагі нашай партыйнай і савецкай крамадзкасьці. Квартальнае заданьне выканана ўсяго на 33,9 ПРОЦ. НЕДАБОР СКЛАДАЕ КАЛЯ 8 МЛН. РУБ.; на гэту суму не забясьпечана фінансаваньне пасобных галін народнай гаспадаркі.

ПЛЯН МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЗУСІМ РЭАЛЬНЫМ, ЁСЬЦЬ УСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ ЯН ТОЛЬКІ ДЛЯ ЯГО ВЫКАНАНЬНЯ, АЛЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ.

Пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва як у горадзе, так і ў вёсцы, значнае паляпшэньне дабрабыту працоўных мас, шматмільённыя ўкладаньні ў капітальнае будаўніцтва, поўная ліквідацыя бескрацоўя — усё гэта стварае ўмовы для пасьпяховага ажыцьцяўленьня фінпляну. Нячуваныя посьпехі капектывізацыі робяць калгасьніка цэнтральнай фігурай замляробства, узьнімаюць на нябывалую вышыню культурна - матар'яльны ўзровень шырокіх працоўных мас, ствараюць моцную апору для ажыцьцяўленьня задач партыі і ўлады на вёсцы.

Трэба толькі актыўнасьць рабочых мас гораду, калгасьнікаў і бядняцка-сярадняцкіх мас вёскі накіраваць на барацьбу за выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў, на барацьбу з усякімі спробамі кулацтва і нэпманаў і іх агентуры сарваць гэту важнейшую работу.

Аднак, вялізарныя магчымасьці для ажыцьцяўленьня фінпляну, радам раёнаў БССР не скарыстаны. У той час, калі нашы гарады: Менск, Віцебск, Гомель і значная частка раёнаў — Сіроцінскі, Аршанскі і інш.—паказваюць сапраўды бальшавіцкія тэмпы выкананьня заданьняў па мабілізацыі сродкаў, рад раёнаў упарта з кварталу ў квартал, з месяца ў месяц ня выконваюць кантрольных лічбаў і тым тармозяць бесьперабойнае фінансаваньне сацыялістычнага будаўніцтва. Да такіх раёнаў адносяцца ВУШАЦКІ, ЖЛОБІНСКІ, КАРМЯНСКІ, ТАЛОЧЫНСКІ, УВАРАВІЦКІ, ЧАЧЭРСКІ, БАБРУЙСКІ І НЕКАТОРЫЯ ІНШЫЯ РАЁНЫ.

Прычыны прарываў карэняцца ў ПОЎНАЙ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ, ПАЛІТЫЧНАЙ БЛІЗАРУКАСЬЦІ І АПАРТУНІСТЫЧНАЙ НЕДААЦЭНЦЫ ФІНПЛЯНУ з боку раду партыйных арганізацый. Чым іншым можна тлумачыць факт сыстэматычнага зрыву фінпляну, роспуску фінапарату ў адпачынак у самы разгар налічэньня сельгаспадатку (Жлобінскі раён), або злачынна раўнадушных адносін да перабояў у выплаце зарплаты нестаўніцтву 1 г. д. (Чачэрскі раён).

Асноўнымі відамі плацяжоў у трэцім квартале зьяўляюцца сельгаспадатак і страхоўка (40 проц. пляну), пазыка і ўклады ў ашчадкасы (30 проц.) і ПАІ каапэрацыі. (10 проц.).

Па сельгаспадатку на 20 жніўня паступіла 32 проц. квартальнага і 12 проц. гадавога пляну, а па СТРАХОЎЦЫ — 15,1 проц. квартальнага і 8 проц. гадавога пляну.

Зусім недапушчальным зьяўляецца той факт, што з кулакоў спагнана толькі 11 проц. заданьня, у той час, калі тэрмін спагнаньня плацяжоў канчаецца 1 верасьня. Гэта гаворыць аб лўным ПАТУРАНЬНІ КУЛАЦТВУ ў радзе раёнаў, аб нежаданьні саарыцца з кулаком. Ці дапушчальна такое становішча, калі сераднякі - аднаасобнікі і калгасьнікі ўнесьлі ў процантных адносінах больш сельгаспадатку, чым кулакі?

Зусім слаба разгорнута работа па ДАТЭРМІНОВЫМ ПАСТУПЛЕНЬНІ ПЛАЦЯЖОЎ, асабліва па калгасах. Калгасы яшчэ ня сталі арганізатарамі гэтай кампаніі на вёсцы. Калгасьніні ня ўцягнуты ў барацьбу за поўнае спагнаньне падатку і страхоўкі з кулака.

У той час, калі ў радзе раёнаў спагнаньне абавязковых плацяжоў арганізавана вельмі добра (па Сіроцінскім раёне паступіла 46 проц. налічаных сум, па Парыцкім — 32 проц., Магілёўскім —29,7 проц., Хойніцкім—28,8 проц.) пасобныя раёны ганебна зрываюць гэту кампанію. (Вушацкі — 5,3 проц., Уваравіцкі — 4,9 проц., Чырвона-Слабодзкі—6 проц. і г. д.). Гэта сьведчыць об яўным ігнараваньні дырэктыў партыі і ўраду па важнейшым пытаньні аб апартуністычнай стаўцы на самацёк аб важнейшым вучастку клясавай барацьбы.

Нездавальняюча паступаюць узносы ПА ПАЗЫЦЫ імя трэцяга рашаючага. Праведзеная з посьпехам падпіска сярод рабочых і служачых (на 20 жніўня —114,9 проц.) не замацавана поўнасьцю праз афармленьне падпіскі. Работнікі фінансава - банкаўскага апарату ня здолелі скарыстаць актыўнасьці рабочых мас для своячасовага афармленьня падпіскі. У выніку бязьдзейнасьці мясцовых арганізацый і камісій садзейнасьці падпіскі пазбаўляюцца даных ім льгот, з-за позьняга афармленьня падпіскі скарачаецца тэрмін выплаты пазыкі.

Трэба адзначыць слабое паступленьне ПАЁЎ ПА КААПЭРАЦЫІ на вёсцы (38,5 проц.), дрэнную рэалізацыю АКЦЫЯЎ ТРАКТАРАЦЭНТРУ (33,6 проц.) і ганебны прарыў па рэалізацыі АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ НА СЕЛЬГАСМАШЫНЫ (16,6 проц.).

ТАКОЕ СТАНОВІШЧА ДАЛЕЙ НЕЦЯРПІМА. БССР павінна неадкладна ліквідаваць прарывы ў мабілізацыі сродкаў і выйсьці на першае месца па Савецкім Саюзе. ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ ЎЗЯЦЬ ГЭТУ РАБОТУ ПАД СВАЁ ШТОДЗЁННАЕ КІРАЎНІЦТВА і вытрэсьці апартуністычны самацёк на важнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба праверыць ход спагнаньня сельгаспадатку на мясцох. Неабходна штурмаваць прарывы на вучастку спагнаньня падатку з кулацкіх гаспадарак. У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ПАДАТАК З КУЛАКОЎ ПАВІНЕН БЫЦЬ СПАГНАНЫ ПОЎНАСЬЦЮ.

Адначасова трэба рашуча змагацца са спробамі індывідуальнага абкладаньня працоўных сераднякіх гаспадарак. Трэба разгарнуць масавую работу вакол датэрміновай здачы сельгаспадатку і страхоўкі сераднякам і калгасьнікамі, для чаго належыць правесьці растлумачальную работу на сходах, скарыстаўшы сходы па самаабкладаньні, шырока прак тыкаваць падворны абход, уцягваючы ў гэту работу сельскі актыў і шырокія масы калгасьнікаў. Трэба арганізаваць датэрміновую здачу сельгаспадатку калгасамі.

Неабходна яшчэ раз праверыць афармленьне падпіскі на пазыку імя трэцяга рашаючага і забясьпечыць паступленьне першага ўзносу ў жніўні г. г.

Праверку афармленьня трэба ўвязваць з далейшай работай па ахопе тых рабочых і служачых, якія яшчэ не падпісаліся на пазыку. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ, СЯРОД АДНААСОБНІКАЎ. Тут трэба скарыстаць мэтад арганізацыі падпіскі пры выплаце заработку на сэзонных работах і на загатоўчых пунктах, які практыкуецца ў радзе раёнаў. Гэта работа павінна быць праведзена на аснове ШЫРОКАЙ МАСАВАЙ ПРАЦЫ. НІ ў якім разе нельга дапусьціць адміністрацыйнага навязваньня аблігацый. Усялякія перагібы, якія парушаюць прынцып добраахвотнасьці павінен быць неадкладна ліквідаваны.

СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЭРАЦЫЯ павінна ўзмацніць работу па зборы паявых узносаў. Белкаапсаюзу трэба ўзьдзейнічаць на тыя раёны, якія забыліся аб тым, што далейшае ўзмацненьне фінансавай базы каапэрацыі магчыма толькі за лік уцягненьня сродкаў саміх пайшчыкаў.

Неабходна мабілізаваць пралетарскую грамадзкасьць на РЭАЛІЗАЦЫЮ АКЦЫЯЎ ТРАКТАРАЦЭНТРУ І АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ НА СЕЛЬГАСМАШЫНЫ, растлумачыўшы кожнаму калгасьніку бедняку і серадняку, што затрымкі ў рэалізацыі акцый і абавязацельстваў перашкаджаюць завозу трактароў і с.-г. машын і тармозяць машынізацыю калёк тывізаванай вёскі.

Кулак прымае ўсе меры, каб сарваць САМААБКЛАДАНЬНЕ. Жорстая барацьба з кулаком за поўнае выкананьне пляну самаабкладаньня, справа ўсёй савецкай вясковай грамадзкасьці.

Нельга не адзначыць, што за апошнія дні наглядаецца некаторы пералом у радзе раёнаў, якія раней адставалі. Гэта таксама паказвае, што пры ўмове бальшавіцкай барацьбы за фінплян ёсьць усе магчымасьці для яго выкананьня.

Усе сілы трэба кінуць на ажыцьцяўленьне важнейшай задачы — стварэньня фінансавай базы сацыялістычнага будаўніцтва ў 3-м рашаючым годзе пяцігодкі.

# У трэцім квартале фінплян выканан толькі на 33,9 проц.

### СПАГНАЦЬ ПЛАЦЯЖЫ З КУЛАКА, РАШУЧА УДАРЫЦЬ ПА ЯГО АГЕНТАХ-АПАРТУНІСТАХ!

ПАСТУПЛЕНЬНІ ПА АСНОЎНЫХ ВІДАХ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ НА 20 ЖНІЎНЯ
(У ПРОЦАНТНЫМ ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ НА 3 КВАРТАЛ)

| Пазыка ў горадзе | С.-г. падатак | Уклады ў ашчадкасы | Паі па вясковай спажыўкаапэрацыі | Страхавыя ўзносы |
|---|---|---|---|---|
| 18,2 | 31,9 | 18,2 | 38,5 | 15,1 |

## Аднаасобны сэктар—баявы вучастак рэалізацыі

Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву камуністычнай партыі, вялікаму энтузіязму рабочай клясы, калгасьнікаў і шырокіх бядняцка-сераднякіх мас сялянства, а таксама актыўнаму ўдзелу ўсіх савецкіх і грамадзкіх арганізацый, пазыка імя трэцяга рашаючага рэалізавана сярод рабочых і служачых БССР на 26.333 тыс. рублёў, або 114,9 проц. кантрольнай лічбы, а сярод калгасьнікаў — на 129,6 проц. заданьня.

Аднак, ня гледзячы на пасьпяховае ажыцьцяўленьне кантрольных лічбаў, мы маем на сёньняшні дзень звыш 2.000 рабочых і звыш дзесяці тысяч калгасьнікаў яшчэ неахопленых падпіскай. Гэта абавязвае ўсе фінансава-крэдытныя ўстановы, усе прафарганізацыі і грамадзкасьць, ЗГУРТАВАЦЬ УВАГУ НА ПОЎНЫМ АХОПЕ ПАДПІСКАЙ УСІХ РАБОЧЫХ І КАЛГАСЬНІКАЎ, НЕ СУПАКОЙВАЮЧЫСЯ НА ДАСЯГНУТЫХ ПОСЬПЕХАХ.

Мы маем поўны прарыў у выкананьні кантрольнай лічбы па АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ ВЁСКІ (13,9 проц. кантрольнага заданьня).

Чаму так адстае аднаасобны сэктар?

Справа ў тым, што ХВАЛЯ ЭНТУЗІЯЗМУ ПРАЦОЎНЫХ ВЁСКІ НЯ БЫЛА ЗАМАЦАВАНА, РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЗЫКІ НЕ НАБЫЛА ЎДАРНЫХ ТЭМПАЎ, ФІНАНСАВА - КРЭДЫТНЫ АПАРАТ, КАМСАМОЛЬСКІЯ І ПРАФСАЮЗНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕ ЗЬВЯРНУЛІ ЎВАГІ НА ГЭТЫ АДКАЗЬНЕЙШЫ ВУЧАСТАК РАБОТЫ.

Вялікую ролю ў прарывах адыгралі ПЕРАГІБЫ ў радзе раёнаў, якія парушылі прынцып добраахвотнасьці ў рэалізацыі (Вушацкі, Сураскі, Жлобінскі, Парыцкі, Чэрыкаўскі рэёны). Кантрольныя лічбы даводзіліся да пасобных вёсак і двароў; замест масава-растлумачальнай работы ўжывалі адміністрацыйнае навязваньне аблігацый; даводзілі цьвёрдыя заданьні па пазыцы да сераднякіх двароў і г. д. У Парыцкім раёне было абвешчана, што хто не набудзе аблігацый, той ня зможа абмапаціць збожжа на ямыне. У некаторых раёнах не рэгістравалі ў ЗАГС'е тых, хто не набываў аблігацый і г. д. Побач з гэтым наглядаліся апартуністычныя адносіны да кулака. Цьвёрдыя заданьні кулацкім гаспадаркам ня былі даны, ня прыняты меры грамадзкай узьдзейнасьці для спагнаньня плацяжоў. Загадчык Чэрыкаўскай райашчадкасы, разам з прэзыдыумам Ветрынаўскага сельсавету, даў цьвёрдыя заданьні ўсяму сельсавету. Загадчык райфа Вушацкага раёну заявіў, што «мы можам праводзіць рэалізацыю без грамадзкасьці, у нас ёсьць фінансавы апарат». Гэтыя перагібы зараз выпраўлены, але яны прынесьлі шмат шкоды справе рэалізацыі.

Наглядаюцца рэзкае РАЗЫХОДЖАНЬНЕ ПАМІЖ ПАДПІСКАЙ І АФАРМЛЕНЬНЕМ і вялікі недабор паступленьня ўзносаў па пазыцы. У Магілеве афармлена толькі 21 проц. падпіскі, у Барысаве — 34 проц., у Бабруйску — 20,2 проц., у Рэчыцы — 42,6 проц. Паступіла па гэтых гарадох узносаў толькі 12 — 16 проц. заданьня.

Вельмі дрэнна стаіць справа з рэалізацыя пазыкі сярод СЭЗОННЫХ РАБОЧЫХ. Ня гледзячы на рад дырэктыў, на мясцох амаль нічога ня зроблена.

Трэба адзначыць, што ў раёнах быў вельмі дрэнна скарыстаны калгасны актыў для рэалізацыі пазыкі па аднаасобным сэктары. Наогул, райкалгассаюзы прымалі вельмі слабы ўдзел у рэалізацыі пазыкі. Камісіі садзейнасьці ў радзе месц ня сталі арганізатарамі і кіраўнікамі падпіскай кампаніі.

Бліжэйшыя задачы—ПЕРАКЛЮЧЫЦЬ НА ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ ПА АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ, ШЛЯХАМ МАСАВА-РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОТЫ, ВЫПРАВІЦЬ ДАПУШЧАНЫЯ ПАМЫЛКІ, МЕРАМІ ГРАМАДЗКАЙ УЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ НАЦІСНУЦЬ НА КУЛАКА І ДАБІЦЦА СПАГНАНЬНЯ ЎЗНОСАЎ З КУЛАЦКІХ ГАСПАДАРАК, МАБІЛІЗАВАЦЬ УВАГУ ГРАМАДЗКАСЬЦІ ВАКОЛ АФАРМЛЕНЬНЯ ПАДПІСКІ І ПАСТУПЛЕНЬНЯ ПЕРШЫХ УЗНОСАЎ, І, НАРЭШЦЕ, УЦЯГНУЦЬ У ПАДПІСКУ ЎСІХ ТЫХ, ХТО ДАГЭТУЛЬ НЯ БЫЎ АХОПЛЕН ПАЗЫКАЙ.

ЗАХАРАВА.

## АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА
### выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў на трэці квартал (паводле даных на 20 жніўня; у тысячах рублёў)

| ПЛАЦЯЖЫ | Плян на квартал | Паступіла на 20/VIII | Проц. выкананьня квартальн. пляну |
|---|---|---|---|
| Адзіны с.-г. падатак | 8.300 | 2.645 | 31,9 |
| Акладное страхаваньне | 9.230 | 1.395 | 15,1 |
| **Пазыка «Пяцігодка».** | | | |
| а) горад | 3.900 | 710 | 18,2 |
| б) вёска | 3.788 | 610 | 16,1 |
| Жылзбор | 1.100 | 1.462 | 132,9 |
| Культзбор | 70 | 133 | 190,0 |
| Падаходна-прамысловы падатак | 1.300 | 912 | 60 |
| Уклады ў ашчадкасу | 3.500 | 636 | 18,2 |
| Звароты о.-г. пазык | 3.520 | 1.130 | 32,1 |
| Акцыі Трактарацэнтру | 1.000 | 338 | 33,8 |
| **Спажыўкаапэрацыя:** | | | |
| Паі — горад | 1.200 | 515 | 42,9 |
| Паі — вёска | 2.800 | 1.077 | 38,5 |
| **Уклады і авансы:** | | | |
| а) горад | 905 | 1.149 | 127 |
| б) вёска | 700 | 881 | 125,9 |
| Абавязацельствы на с.-г. машыны | 1.359 | 225 | 16,6 |
| **Калгассыстэма:** | | | |
| Уступн. узносы | 250 | 328 | 131,2 |
| Мэтав. узносы | 280 | 37 | 13,2 |
| **РАЗАМ** | 46.052 | 15.615 | 33,9 |

## Сіроцінскі раён заваёўвае пераходны сьцяг

У другім квартале г. г. Аршанскі раён заняў першае месца ў БССР па выкананьні фінпляну (101 проц. заданьня). Ён атрымаў, паводле пастановы калегіі НКФ, пераходны чырвоны сьцяг.

Сіроцінскі раён паставіў перад сабой задачу—адваяваць гэты сьцяг. Працаўлікі раёну некалькі раз правяралі свае лічбы—магчыма, яны абагналі аршанцаў, і Аршанскі раён атрымаў сьцяг не на волгах,—аднак, вымушаны быў прызнаць, што Сіроцінскі раён у другім квартале некалькі адстаў ад Аршанскага (93,3 проц. выкананьня пляну).

З гэтага часу ў Сіроцінскім раёне пачынаецца ўпартая, настойлівая, бальшавіцкая барацьба за поўнае ажыцьцяўленьне фінансавага пляну трэцяга кварталу. Сіроцінцы дабіліся вялікіх посьпехаў у гэтай галіне. У трэцім квартале Сіроцінскі раён выйшаў на першае месца, выканаўшы 55 проц. квартальнага пляну (да 20 жніўня) і значна абагнаў Аршанскі раён, які выканаў плян на 44,5 проц.

Якімі мэтадамі дабіўся Сіроцінскі раён такіх значных посьпехаў. Пытаньне мабілізацыі сродкаў вынесена за сцены ведамстваў і ўзьнята на напежную палітычную вышыню. Мабілізацыя сродкаў пастаўлена ў цэнтры ўвагі партыйных і савецкіх арганізацый і ўвязана з правядзеньнем усіх палітычна-гаспадарчых кампаній. У дотымадна з галоўных прычын посьпеху.

Праводзіцца шырокая масава-растлумачальная работа. Раён адмовіўся ад кампанейшчыны і вядзе штодзённую барацьбу за фінплян. Акрамя сходаў і нарад па фінансавых пытаньнях, скарыстоўваюцца ўсе іншыя сходы і нарады. Шырока ўжываюцца мэтады сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва пасобных сельсаветаў і калгасаў.

Райфінаддзел, якім кіруе рабочы вылучнец тав. Янкін, аброс вялікім пасобным актывам, у большай частцы і калгасьнікаў.

Раённыя кіруючыя арганізацыі штодзённа сочаць за фінработай, за выкананьнем даных дырэктыў. Пасьля кажнага чэньня кожнай дэкады шры райфа скліканцца нарады ўсіх арганізацый, зьвязаных з выкананьнем пляну мабілізацыі сродкаў, асабліва адсталых сельсветаў і сельскіх спажывецкіх таварыстваў.

Вядзецца рашучая і ўпартая барацьба з кулаком і яго саюзьнікамі — правымі і «левымі» апартуністамі. Старшыня Вобальскага сельсавету Лузгін, які сыстэматычна зрываў мабілізацыю сродкаў і хныкаў, спасылаючыся на непасільнасьць тамнаў, быў зьнят з работы. Праўленьне райсаюзу за бязьдзейнасьць аддана пад суд.

Сіроцінцы не абмежаваліся рэпрэсыўнымі мерамі. Яны энэргічна ўзяліся за ліквідацыю прарываў на пасобных вучастках. Для дапамогі сельскім спажывецкім таварыствам быў прыцягнут вясковы актыў. У выніку рад сельскіх таварыстваў ліквідавалі прарывы. Тэрабіцкае спажывецкае таварыства ліквідавала прарыў на працягу адной дэкады. Трэба адзначыць, што прафэсыянальныя арганізацыі пасылалі на вёскі брыгады і дапамагалі мабілізацыі сродкаў.

Сіроцінскія фінработнікі абвясьцілі сябе зараз ударнікамі і абавязаліся поўнасьцю выканаць фінплян трэцяга кварталу да 20 верасьня з тым, каб працаваць апошнюю дэкаду кварталу над перавыкананьнем пляну. Раён узяўся дапамагчы Вушацкаму раёну, які выканаў плян толькі на 15,9 проц. — ліквідаваць прарывы ў мабілізацыі сродкаў.

Прыкладу Сіроцінцаў павінны паследаваць усе раёны.

Мікалаеў.

## Прымусовы асартымэнт і пустыя паліцы

Вялізарнае значэньне для паскарэньня тэмпаў накапленьня ў нашай краіне і ўмацаваньне грашовай сыстэмы мае правільная арганізацыя тавараазвароту.

На жаль, сыстэма спажывецкай каапэрацыі БССР да гэтага часу не павярнулася яшчэ тварам да тавараазвароту, не аддае гэтай справе належнай увагі.

Вось факты, якія ілюструюць становішча на мясцох.

У БУДА-КАШАЛЕЎСКІМ раёне крамы на вёсцы адкрыты толькі па 2-3 гадзіны ў дзень, а некаторыя (Будапюшаўская, Гібіцкая і інш.) цэлымі днямі зусім закрыты. У Нядзейскай краме вывешана абвестка: «На пайшчыкам уваход у краму забаронен».

Агідная бяспляннасьць панае ў завозе тавару. У той час, калі частка раёнаў зьядхаецца ад адсутнасьці некаторых недэфіцытных тавараў (соды, гуталін, сінька і г. д.), іншыя райспажыўсаюзы выдаюць гэтыя тавары пайшчыкам, як прымусовы асартымэнт, каб разгрузіць свае склады ад залежаў гэтых тавараў. У Полацкім, напрыклад, завезена запалак і шчотак, якіх можа хапіць... на 5 год. У той-жа час быхаўскі райспажсаюз атрымаў «сакрэтнае» распараджэньне аб забраніваньні 150 скрынак запалак. У выніку — у крамах Быхава няма запалак.

Залежы тавараў на складах каапэрацыі — звычайнае зьявішча.

На складах Быхаўскага райспажыўсаюзу ўжо некалькі месяцаў ляжаць мёртвым капіталам «барэткі» (боты на дрыў лянай падошве) на 5.000 руб., каля 1.000 клгр. пернікаў, якія не прадаюцца з прычыны дрэннай якасьці.

У Капаткевіцкі раён яшчэ зімою завезены лямпы без гарэлак і бяз шкла, у Азарыцкі раён завезена 4.500 лямп без гарэлак. Ельскія «мудрацы» з каапэрацыі праявілі асабістую «ініцыятыву» і закупілі вялікую колькасьць фэтравых капялюшоў (гэта для сельскай мясцовасьці). Гэтыя капялюшы ўведзены, як прымусовы асартымэнт. Такім чынам, рабочы ці селянін, які купляе пару дзіцячага абутку за 7 руб., прымушан узяць, у якасьці прымусовага асартымэнту і фэтравы капялюш за 14-17 руб.

Побач з затаварваньнем ёсьць раёны, дзе крамы спажыўкаапэрацыі літаральна пустуюць (Чэрыкаўскі і інш.).

Недапушчальна дрэнна пастаўлена ФІНАНСАВАЯ ДЫСЦЫПЛІНА ў каапэрацыйнай сыстэме. Жлобінскі райспажыўсаюз, напрыклад, из працягу ліпеня здаў у касу банка выручкі ў суме 60.000 руб. і самавольна пусьціў яе на розныя загатоўкі. У красавіку гэтым-ж райспажыўсаюз затрымаў выручку ў 30.000 руб.

Трэба пакласьці канец бязадказным адносінам да арганізацыі тавараазвароту і фінансавай дысцыпліны. Трэба дабіцца нармальнага і плянавага завозу тавараў у раённыя цэнтры, пашырыць прасоўваньне прадуктаў і прамтавараў да рабочага спажыўца.

Э. С—н.

## Прамысловасьць БССР не дадала 8 млн. руб.

Ня гледзячы на значныя дасягненьні народнай гаспадаркі БССР у параўнаньні з мінулым годам—за 7 месяцаў валавая прадукцыя прамысловасьці ВСНГ узрасла на 43,5 проц.; прадукцыя прадпрыемстваў Наркамснабу—на 33,7 проц.; калектывізавана 45,5 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак,—трэба адзначыць, што агульнае выкананьне народна-гаспадарчага пляну за 7 месяцаў 1931 г. як па колькасных так і па якасных паказальніках, зьяўляецца нездавальняючым.

Рэспубліканская прамысловасьць ВСНГБ у першым паўгодзьдзі не дадала прадукцыі на 25 млн. руб., у ліпені яна ня толькі не пакрыла недаборку першага паўгодзьдзя, але паглыбіла прарыў—недабор прадукцыі ў ліпені складае 27 проц. пляну.

Дырэктывы аб зьніжэньні сабекошту як і раней ня выконваюцца. Замест запраектаванага зьніжэньня сабекошту на 8,1 проц., прамысловасьць фактычна ніякага зьніжэньня не дала. Па некаторых прадпрыемствах наглядаецца нават павышэньне сабекошту. Так, напрыклад цьвіковы завод «Чырвоны Кастрычнік» павысіў сабекошт на 19,2 проц., гута «Каміньтэрн» на 23,4 проц., фабрыка «Дзьвіна»—на 29,6 проц.

Аб тым, што плян зьніжэньня сабекошту зьяўляецца зусім рэальным, сьведчыць вопыт пасобных заводаў, якія паказалі бальшавіцкую настойлівасьць у выкананьні прамфінпляну. Завод «Бальшавік» дабіўся зьніжэньня сабекошту на 6,2 проц. пры заданьні ў 4,2 проц., Якаўлевіцкая суконная фабрыка зьнізіла сабекошт на 20,6 проц., пры плянавым заданьні ў 13,5 проц. Невыкананьне пляну выпуску прадукцыі і зьніжэньня сабекошту прывяло да прарываў у пляне накапленьня прамысловасьці ВСНГ і Наркамснабу за першае паўгодзьдзе на суму прыблізна 8 млн. руб.

**

Хаця ў колькасных паказальніках плян тавараазвароту спажывецкай каапэрацыі за ліпень перавыкананы (103 проц.), аднак якасныя вынікі нездавальняючыя. Белкаапсаюз толькі ў канцы ліпеня давёў да периферыі нормы накладных і гандлёвых выдаткаў. Такуль што нічога ня зроблена для ажыцьцяўленьня гэтых норм. У Белкаапсаюзе няма ўзіку сапраўдных разьмераў накладных і гандлёвых выдаткаў.

Недавыканана заданьне па разгортваньні гандлёвай сеткі. У выніку гэтага—зварот на раздробным гандлі аб'яднаньняў Белкаапсаюзу складаў у ліпені 1.181 тыс. руб. супроць 2.300 тыс. на пляне.

Спажывецкая каапэрацыя не прыняла рашучых мер да ліквідацыі запазычанасьці па паёх і ўцягненьні новых пайшчыкаў. Да 20-га жніўня квартальны плян палнаканаленьня выкананы на гораде на 42,9 проц., а па вёсцы на 38,5 проц.

Новыя формы крэдытаваньня і мэтавы крадыт, які пачаў ужывацца ў ліпені, у значнай меры садзейнічалі узмацненьню гаспадарчага разрахунку і прымушалі гаспадарчыя арганізацыі прыняць рашучыя меры да выкананьня колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну. Аднак, трэба адзначыць невыстарчальную крэдытную ўзьдзейнасьць з боку дзяржаўнага банку, да тых, арганізацый, што парушалі свае прамыслова-фінансавыя пляны і фінансавую дысцыпліну.

Гочнфэст.

## З кулакоў спагнана толькі 11 проц. сельгаспадатку

Паступленьне сельгаспадатку па БССР ідзе зусім дрэнна. Ліпеньскі плян збору падатку ня выкананы. Замест 1.350.000 руб. паступіла толькі 374.000 руб., або 27,7 проц. пляну.

Дзьве дэкады жніўня ня толькі не далі пералому ў ходзе кампаніі, але падаварот яшчэ паглыбілі прарыў. На 20 жніўня з пачатку кампаніі паступіла ўсяго 2.645.000 руб., што складае 48,1 проц. пляну.

З кулацкіх гаспадарак да 1 верасьня павінна паступіць каля 1.500 тыс. руб. На 20 жніўня ў лік гэтай сумы спагнана ўсяго 165.000 руб., што складае 11 проц.

Такім чынам, дырэктыва ЦК КП(б)Б і ўраду БССР аб тым, каб у жніўні ня толькі поўнасьцю выканаць месячнае заданьне, але і пакрыць ліпеньскі недабор—пад пагрозай невыкананьня, а па радзе раёнаў фактычна сарвана.

Асобліва дрэнна праходзіць кампанія па Бабруйскім раёне, які выканаў толькі 1,9 проц. заданьня, Асьвейскім—8,8 проц., Мсьціслаўскім—6,5 проц., Расонскім—13,2 проц., Уваравіцкім—16,5. Чэрыкаўскім—16,1 проц. і г. д.

Чым тлумачыцца гэтае ганебнае адставаньне? Асноўная прычына—выключнея бязьдзейнасьць сельскіх саветаў і фінансавага апарату, праваапартуністычнае спадзяваньне на самацёк, адсутнасьць усякага кіраўніцтва кампаніяй з боку раду мясцовых арганізацый.

Матар'ялы абследаньня, праведзенага Наркамфінам па асобных раёнах, сьведчаць аб недапушчальнай нядбайнасьці, расхлабанасьці, і бездаказнасьці некаторых раённых арганізацый. Так па Бабруйскім, Асьвейскім, Дубровенскім і Жлобінскім раёнах акладныя лісты ў пачатку жніўня яшчэ ня былі нават перададзены платнікам, а па Гарадоцкім раёне на 12 жніўня ня толькі ня былі перададзены акладныя лісты, але нават ня скончан падлік аб'ектаў абкладаньня. Па Быхаўскім раёне акладныя лісты былі перададзены толькі некалькі дзён назад.

Агітацыйна-масавая работа за датэрміновую выплату падатку праводзіцца нездавальняюча, а ў радзе раёнаў зусім не наладжана. Буда-Кашалёўскі райфа падмяніў агітацыйна-масавую работу сярод калгасьнікаў выпіскай акладных лістоў па падатку калгасам. Між тым, паводле закону, ніякія акладныя лісты калгасам ня выпісваюцца, налічэньні падатку робяць самі калгасы.

Да кулацкіх гаспадарак прымусовыя меры спагнаньняў у большасьці раёнаў ня прымяняюцца, нават у тых выпадках, калі кулакі разбазарваюць свае маемасьць. Раённыя арганізацыі чакаюць, пакуль кулакі самі прынясуць падатак.

Для выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў трэба за трэцюю дэкаду жніўня сабраць каля 3 млн. руб.—гэта значыць больш чым сабрана з пачатку кампаніі да 20 жніўня. Гэта задача зусім рэальная, калі разгарнуць сапраўды бальшавіцкія тэмпы збору падатку. Лепшым прыкладам могуць служыць Сіроцінскі, Магілёўскі, Мазырскі і Парыцкі раёны, якія на 20 жніўня выканалі звыш 100 проц. сваіх заданьняў. Адстаючыя раёны павінны раўняцца па перадавікох сельгаспадатку.

Р.

## Зьдзельшчына і ўлік—
### РАШАЮЧЫЯ ЗЬВЕНЬНІ
#### УМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ

### Спыніць кулацкую дзяльбу ўраджаю

КОХАНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ, Талачынскага раёну, у асноўным заваяваў суцэльную калектывізацыю. На тэрыторыі сельсавету арганізавана 17 калгасаў, якія аб'ядноўваць 480 бядняцка - сераднякіх гаспадарак.

Але на якасны бок работы калгасаў, на іх гаспадарчае замацаваньне сельсавет зварачаў зусім мала ўвагі. На нарадзе старшыень калгасаў, якая адбылася гэтымі днямі, высьветлілася, што ў 7 калгасах з 17 існуе падзёншчына. З астатніх сапраўдная зьдзельшчына — ўведзена толькі ў адным калгасе «Чырвоны Кастрычнік».

Адсутнасьць зьдзельшчыны і ўліку працы — асноўная прычына прарываў ва ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніях. Так, на 9 праверэных калгасах з 153 гэктараў ільну на 16 жніўня было выцерабляна толькі 43 га, або 28 проц. Калгас «Чырвоны коханавец» які мае 36 гэкт. ільну, да ўборкі яго яшчэ не прыступіў. У калгасе ёсьць звыш 16 цэнтн. неапрацованага ільну мінулага году.

Ні адзін з калгасаў яшчэ ня склаў кармовага балянсу, ня высьветліў патрэбнасьці ў кармох для агрэмаджанай жывёлы. Затое, у радзе калгасаў, як «Чырвоныя Ліпінкі», «Пераможца», «Гігант» ужо пачалася дзяльба сена па кулацкім урэзунілаўскім прынцыпе — на 10 цнт. на карову, незалежна ад таго, колькі працавалі той ці іншы калгасьнік. Пастанова Наркамзему СССР аб прыкладным разьмеркаваньні даходаў у гэтых калгасах зусім не распрацавана. Гэта спрыяло да буйнейшых памылак і скажэньняў дырэктыў партыі.

Такім чынам ва ўсім сельсавеце толькі адзін калгас «Чырвоны Кастрычнік» сапраўды правільна арганізаваў і расставіў рабочую сілу, наладзіў улік работы і запіс працадзён у кніжкі калгасьнікаў. Дзякуючы гэтаму калгас «Чырвоны Кастрычнік» з 26 

# МЭНЮ НА СЛУЖБУ ПРАМФІНПЛЯНУ

## ДА 15-га ВЕРАСЬНЯ АРГАНІЗАВАЦЬ БРАКЕРАЖ ВА УСІХ СТАЛОУКАХ

### Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ аб мерах паляпшэньня грамадзкага харчаваньня ад 25 жніўня

Выходзячы з пастановы ЦК УсеКП(б) і мерах па паляпшэньні грамадзкага харчаваньня ад 19 жніўня, прэзыдыум ЦСПСБ пастанаўляе:

1. Усім ЦП, ФЗМК і гаррайпрафсаветам бязадкладна разгарнуць шырокую кампанію да 5 верасьня па прапрацоўцы пастановы ЦК УсеКП(б) у цэхах, пленах, брыгадах, практычна дастасоўваючы яе да ўмоў свайго прадпрыемства, установы, цэху, каапэратыву і арганізуючы практычны ўдзел рабочых у перабудове грамадзкага харчаваньня і воры рабочых прапаноў.

2. Прапанаваць Белкаапхарчу ў матах паляпшэньня абслугоўваньня рабочых і канцэтызацыі кіраўніцтва арганізаваць 2 групы: першая—па грамадзкім харчаваньні заводскіх рабочых і другую—па грамадзкім харчаваньні ў с.-г. сэктары.

3. Прапанаваць Белкаапхарчу і ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня АРГАНІЗАВАЦЬ БРАКЕРАЖ ВА ЎСІХ СТАЛОЎКАХ, папулярызуючы сярод шырокіх мас значэньне бракеражу. Арганізацыю бракеражу скончыць да 15 верасьня.

4. Прапанаваць Белкаапхарчу, ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня і Наркамфінсаў распрацаваць да 1 верасьня новыя формы аплаты працы на аснове дагрэсыўнай зьдзельшчыны з абавязковым уліком якасьці працы і апрацоўкі. Выпучыць фонд прэміраваньня на лепшую апрацоўку і ўстанавіць МАТЭРЫЯЛЬНУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА БРАК. Усе гэтыя мерапрыемствы ўнесьці на зацьвярджэньне прэзыдыуму ЦСПСБ не пазьней 1 верасьня.

5. Прапанаваць Белкаапхарчу арганізаваць на ўсіх рабочых сталоўках РОЗНАСТАЙНЫЯ МЭНЮ І АБЕДЫ Ў РОЗНЫЯ ЦЭНЫ. ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня і ЦП вытворчых саюзаў прачыць за выкананьнем і не пазьней 10 верасьня паведаміць ЦСПСБ.

6. У матах паляпшэньня якасьці абеду і забесьпячэньня большай рознастайнасьці лічыць неабходным дазволіць усім каапхарчам і загадчыкам сталовак САМАСТОЙНА ПРАВОДЗІЦЬ ЗАКУПКІ ДАДАТКОВЫХ ПРАДУКТАЎ ГАРЧАВАНЬНЯ (акрамя цэнтралізаваных).

7. Абавязаць Белкаапхарч ва ўсіх сталоўках разгарнуць шырокую СЕТКУ ПАПАМОЖНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ. З выбітных разгортваньня гэтых прадпрыемстваў заслухаць на прэзыдыуме ЦСПСБ праз паўтара месяца.

8. Даручыць сацбытавому сэктару ЦСПСБ сумесна з Белкаапхарчам і г. саюзамі да 1 верасьня распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэньні ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ Ў КАЛГАСАХ.

9. Лічыць неабходным узьняць пытаньне перад ВСНГБ аб пашырэньні праграмы па выпрацоўцы тэрмасаў на Барысаўскім заводзе. ЦП саюзу машынабудаўніцтва прыняць меры па забесьпячэньні заводу кваліфікаванай рабсілай, павялічыўшы праграму вырабу і забясьпечыць матар'ялам.

10. У матах паляпшэньня пастаноўкі работы кухароў, выяўленьня лепшых кухароў і перадачы іх вопыту іншым АБВЯСЬЦІЦЬ КОНКУРС НА ЛЕПШАГА КУХАРА. Даручыць сацбытавому сэктару ЦСПСБ сумесна з ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня распрацаваць канкрэтны плян конкурсу.

11. Перавесьці рабочых кухань і разьмеркавальнікаў, кухароў і ФЗВ на другі сытс па рабочым забесьпячэньні.

12. Арганізаваць з 1 па 10 ВЕРАСЬНЯ ДЭКАДНІК РАМОНТУ СТАЛОВАК і паляпшэньня санітарнага стану іх. Даручыць Белкаапсаюзу сумесна з сацбытавым сэктарам ЦСПСБ у 2-дзённы тэрмін распрацаваць канкрэтны плян дэкадніку.

13. Белкаапхарчу да 10 верасьня перавесьці ўсе сталоўкі на гаспадарчы разрахунак, ПРАДСТАВІЎШЫ ЗАГАДЧЫКАМ СТАЛОВАК ПРАВЫ ДЫРЭКТАРОЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ.

14. Прапанаваць ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня разбуйніць існуючыя групавыя камітэты з тым, каб у кожнай сталоўцы, дзе бясьць ня менш 25 чалавек, арганізаваць САМАСТОЙНЫЯ МК. ЦП саюзу і аргсэктару ўстанавіць тэрмін разбуйненьня і забясьпечыць ажыўленьне саюзнай работы ў сталоўках і перанос цэнтру цяжару яе ў сталоўку-групу.

15. Паставіць перад СНК пытаньне аб арганізацыі з 1 студзеня 1932 году ТЭХНІКУМУ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ. Прапанаваць Белкаапхарчу да 10 верасьня арганізаваць КУРСЫ НАРМОЎШЧЫКАЎ У ЛІКУ 60 ЧАЛАВЕК; сэктору кадраў прасачыць за выкананьнем.

16. З МЭТАЮ ПАЛЯПШЭНЬНЯ РАБОТЫ СТАЛОВАК МАБІЛІЗАВАЦЬ 20 ЧАЛАВЕК З ПРАФСАЮЗНАГА І ГАСПАДАРЧАГА АКТЫВУ Ў ЯКАСЬЦІ ЗАГАДЧЫКАЎ СТАЛОВАК.

17. На наступным пасяджэньні прэзыдыуму заслухаць даклады трох ЦП саюзаў, ЦРК, вйцебскага гарпрафсавету, Белкаапхарчу і НК Аховы Здароўя аб ходзе рэалізацыі пастановы ЦК і пастановы прэзыдыуму ЦСПСБ.

18. Гэтую пастанову абвясьціць у друку.

### 20 кіруючых работнікаў—на работу ў якасьці загадчыкаў магазынаў

Цэнтрасаюз і ЦК саюзу работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю пастанавілі давесьці да 1 кастрычніка мабілізацыю 5 тыс. кіруючых работнікаў з апарату на работу ў якасьці загадчыкаў магазынаў.

Па лініі Белкаапсаюзу павінна быць мабілізавана 120 чалавек.

Мабілізацыя праводзіцца са складу кіраўніцтваў і рэвізійных камісій, загадчыкаў і нам. загадчыкаў аддзелаў, сэктараў, секцыямі, інструктараў, інспэктароў і адказных выканаўцаў гандлі, працуючых у цэнтральным апараце, а таксама ў ЦК, ЦРК, райспажыўтаварыствах, гарспажыўтаварыствах, райсаюзах, аўтаномных секцыях, ТСТ і г. д. Для правядзеньня мабілізацыі стварацца спэцыяльныя камісіі. Уся работа павінна быць праведзена з такім разьлікам, каб да 5 верасьня было мабілізавана і накіравана на работу ня менш 5 проц., да 10—ня менш 20 проц., да 15—ня менш 45 проц., да 20—ня менш 70 проц., да 25—ня менш 90 проц. і да 1 кастрычніка—100 проц. кантрольнага заданьня.

Аплата «5-цітысячнікаў» праводзіцца на аснове існуючых тарыфных згод. У выпадку, калі заработак мабілізаваных будзе ніжэй іх ранейшага акладу, ім выплачваецца розьніца.

### Тарфянікі патрабуюць дакладнай і бесьперабойнай работы каапэрацыі

(ЗЬЕЗД ТАРФЯНОЙ КААПЭРАЦЫІ)

На торфараспрацоўках, як і на кожным адказным вучастку сацыялістычнай будоўлі, забесьпячэньне і абслугоўваньне рабочых выяўляецца адным з самых важных пытаньняў.

На ўсебеларускім зьезьдзе торфарабкопаў, які 24 жніўня скончыў сваю работу, выявілася, што ў гэтых адносінах становішча далёка пяспрыяючае.

Дэлегаты, выступаўшыя ў спрэчках, адзначылі, што Белкаапсаюз і райсаюзы праяўляюць недапушчальныя адносіны да завяршэньня арганізацыі торфарабкопаў. Ня гледзячы на двухмесячнае існаваньне торфарабкопаў, да гэтага часу яшчэ ня скончана вылучэньне таварных фондаў. Ня вылучаны таксама і лімітыі. Не разгорнуты самастойныя загатоўкі плодагародніны. Торфарабкопы не перабудавалі ліся і фактычна займаюцца простым размеркаваньнем цэнтралізаваных фондаў для тарфянікаў.

Белкаапсаюз не клапоціцца аб паляпшэньні забесьпячэньня пастаянных рабочых, служачых і спэцыялістаў тарфяной прамысловасьці прамтаварамі і прадуктамі. У выпіку нездавальняючай работы каапэрацыі, па Асінторфе і радзе іншых торфазаводаў нагляцаецца цякучасьць кваліфікаванай рабсілы.

Большая частка выступаўшых таварышоў адзначала, што да гэтага часу на торфазаводах яшчэ ня створана належных умоў для разгортваньня работы торфкопаў. Апошнія ня маюць пастаянных гандлёвых памяшканьняў, скляноў для гародніны і г. д. Гаспадарнікі не аказваюць рабкопам дапамогі ў разгортваньні іх вытворчай работы. Няма канкрэтнай дапамогі і кіраўніцтва з боку Белкаапсаюзу і торфсэкцыі па перазімоўцы рабкопаў на гаспадарчы разрахунак. Крамы і сталоўкі працуюць без уліку выніку сваёй работы. Не ханае рахункоўных і тэхнічных работнікаў.

Пастановена з 1-га студзеня 1932 году арганізаваць на торфазаводах 13 малочных фэрм на 990 малочных кароў, адкормачныя пункты на 540 сьвіней, пабудаваць і адкрыць 9 новых крам на буйнейшых торфараспрацоўках, да 1 кастрычніка ахапіць каапэрацыйным членствам 2.000 рабочых і членаў іх сем'яў. Адначасова павінны быць адкрыты 2 торфарабкопы на новаарганізаваных распрацоўках.

Зьезд патрабаваў ад пазабраскладу праўленьня тарфяной сакладна заняцца пытаньнем бязадкладна заняцца пытаньнем падрыхтоўцы каапэрацыйных кадраў у першую чаргу арганізаваць на ней кастрычніка курсы рахункаводаў бухгальтараў і работнікаў прыла.

Зьезд паслаў прывітаньне КП(б)Б, у якім абавязуецца выканаць дырэктыву партыі аб паляпшэньні бочага забесьпячэньня і ператварэньня торфарабкопаў у сапраўды можныя цэхі рабочага забесьпячэньня.

ГАРАГЛЯД

Барацьба за торф

## ВЫВЕЗЬЦІ ТОРФ!

ВЫКАНАНЬНЕ СЭЗОННАГА ПЛЯНУ ТОРФАЗДАБЫЧЫ Ў ПРОЦ.

| 19 ЖНІЎНЯ | 20 ЖНІЎНЯ | 21 ЖНІЎНЯ | 22 ЖНІЎНЯ |
|---|---|---|---|
| 45,2 | 45,8 | 46,4 | 47,2 |

## ТОРФАЗАВОДЫ БССР

### Да вывазкі здабытага торфу не гатовы

НА 23-ГА ЖНІЎНЯ ТАРФЯНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ ЗДАБЫЛА 330.088,8 ТОНЫ ТОРФУ, ШТО СКЛАДАЕ 47,2 ПРОЦАНТАЎ СЭЗОННАГА ПЛЯНУ.

СКОНЧЫЎ СЭЗОН ТОРФАЗДАБЫЧЫ ЗАВОД «ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНІК», ЯКІ ЗАРАЗ АСНОЎНЫЯ СІЛЫ ПЕРАКІНУЎ НА ФРОНТ СУШКІ, УБОРКІ І ВЫВАЗКІ ТОРФУ.

ШЧЫЛЬНА ПАДЫЙШЛІ ДА ВЫКАНАНЬНЯ СЭЗОННАГА ЗАДАНЬНЯ ТОРФАЗАВОДЫ «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ», ЯКІ ДАЎ 89,6 ПРОЦ. СЭЗОННАГА ПЛЯНУ, «ЗАКРАШЫНСКІ МОХ»—89,1 ПРОЦ. І «НОВАЯ БЕЛАРУСЬ» — 77,8 ПРОЦ.

У СУВЯЗІ З ПОЗЬНІМ ПАЧАТКАМ СЭЗОНУ ГАНЕБНА ЗРЫВАЮЦЬ СВОЙ ПРАМФІНПЛЯН ЗАВОДЫ «ВОЛЬНІЦА», «РЭМІЗАВА», «ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ», «БЯЛІКІ МОХ» І «КАЛЕКТЫЎНАЯ ПРАЦА».

1-ГА КАСТРЫЧНІКА КАНЧАЕЦЦА СЭЗОН ЗДАБЫЧЫ ФРЭЗЭРНАГА ТОРФУ. ВЕРАСЕНЬ І АПОШНІЯ ДНІ ЖНІЎНЯ ПАВІННЫ БЫЦЬ Ў АСНОЎНЫМ ВЫКАРЫСТАНЫ НА БАЯВОЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СУШКІ І ЎБОРКІ МІЛЬЕНАЎ ТАРФЯНЫХ ЦАГЛІН, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА НА ПАЛЕХ СЬЦІЛКІ, А ТАКСАМА НА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ВЫВАЗКІ ЗДАБЫТАГА ТОРФУ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯМ, ФАБРЫКАМ І ЗАВОДАМ РЭСПУБЛІКІ.

УБОРКА І ВЫВАЗКА — ЗАРАЗ ГАЛОЎНЫ ЭТАП РАБОТЫ ТАРФЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ. НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ ГЭТА РАБОТА РАЗГОРТВАЕЦЦА ЗЛАЧЫННА ПАВОЛЬНА.

ЯШЧЭ І ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЯ ВЫРАШАНА ПЫТАНЬНЕ НА КАГО Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ ЎСКЛАДЗЕНА ПЭРСАНАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА ВЫВАЗКУ ЗДАБЫТАГА ТОРФУ.

З 22-Х ТОРФАЗАВОДАЎ НІ АДЗІН НЯ ПРЫМАЕ РАШУЧЫХ ЗАХАДАЎ ДА ТАГО, КАБ ФАРСАВАЦЬ ТЭМПЫ ЎБОРКІ І ВЫВАЗКІ. ТОРФАЗАВОДЫ ЛІЧАЦЬ, ШТО СПРАВА ВЫВАЗКІ ЎСКЛАДЗЕНА НА СПАЖЫЎЦОЎ І АМАЛЬ ЗУСІМ НЯ РЫХТУЮЦЦА ДА ГЭТАЙ РАБОТЫ.

ПА ГЭТЫХ ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНЫХ ТЭНДЭНЦЫЯХ І ДЭМАБІЛІЗАЦЫЙНЫХ НАСТРОЯХ ТРЭБА РАШУЧА ЎДАРЫЦЬ.

ВСНГ І БЕЛТОРФ ПАВІННЫ НА ПРАЦЯГУ 3-Х ДЗЕН ВЫРАШЫЦЬ ПЫТАНЬНЕ ХТО ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АДКАЗНЫМ ЗА ВЫВАЗКУ ТОРФУ, КАБ ГЭТЫМ САМЫМ ПОЎНАСЬЦЮ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ВЫВАЗКУ ТОРФУ ЗАВОДАМ —СПАЖЫЎЦОМ І НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕ ДАПУСЬЦІЦЬ ЗРЫВУ ГЭТАЙ РАБОТЫ.

БЕЛТОРФ ПАВІНЕН ДАЦЬ ЦЬВЕРДУЮ ЎСТАНОЎКУ ТОРФАЗАВОДАМ У АРГАНІЗАЦЫІ СВАЯГО ЎЛАСНАГА ГУЖАВОГА ТРАНСПАРТУ, ЗЬВЯРНУЎШЫ АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ НА МЭХАНІЗАЦЫЮ АПОШНЯГА.

ТРЭБА НЕАДКЛАДНА ПАДРЫХТАВАЦЬ УСЕ ДАРОГІ ДЛЯ ТРАКТАРНАЙ ВЫВАЗКІ.

БЕЛКАЛГАСЦЭНТР ПАВІНЕН ДАЦЬ У РАСПАРАДЖЭНЬНЕ ТОРФЗАВОДАЎ ВУСЕНІЧНЫЯ ТРАКТАРЫ, ЯКІЯ ЁН МАЕ ДЛЯ ВЫВАЗКІ ТОРФУ.

АБАВЯЗАК РАЙВЫКАНКОМАЎ ЗАРАЗ-ЖА ВЫЛУЧЫЦЬ ПЭЎНУЮ КОЛЬКАСЬЦЬ ВЕСАК І КАЛГАСАЎ, ЯКІЯ МОГУЦЬ ЗАЙМАЦЦА ВЫВАЗКАЙ ТОРФУ.

БЕЛТОРФ ПАВІНЕН ДАСТАЦЬ ПАТРЭБНУЮ КОЛЬКАСЬЦЬ РЭЕК ПАРАВОЗАЎ, ВАГАНЭТАК І АЎТАМАБІЛЯЎ.

ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ ТОРФЗАВОДАЎ І ГАСПАДАРЧАЕ КІРАЎНІЦТВА АПОШНІХ АБАВЯЗАНЫ ЗАРАЗ ГАЛОЎНЫЯ СІЛЫ РАБОЧЫХ КІНУЦЬ ІМЕННА НА ФРОНТ СУШКІ, УБОРКІ І ВЫВАЗКІ, НЕ АСЛАБЛЯЮЧЫ РАЗАМ З ГЭТЫМ І ТЭМПАЎ ЗДАБЫЧЫ.

ГАЛАЕЎ

## „Мы дамо 25.300“...

У 4-х кілёмэтрах ад Вабруйску паўдоўж балота раскінуўся рабочы пасёлак торфазаводу «Новая Беларусь».

Праз пасёлак праходзіць дарога, якая алучае горад з балотам. Паабапал дарогі стаяць у рад яшчэ не пасівеўшыя ад дажджу баракі. У кожным бараку размешчана адна брыгада тарфянікаў. Пасёлак радыёфікаван. У кожным бараку, у кожнай кватэры, сталоўцы, клюбе установлены гучнагаварыцелі. Завод мае свой радыёвузел.

У пасёлку чуваць адрывістае пыхценьне шматлікіх машын 4-х агрэгатаў. Час ад часу паветра разрывае прарэзьлівы гудок заводу, роха якога разносіцца па балоце, далятае да лесу і вяртаецца назад.

Хто быў на гэтым балоце поўмесяца назад, той адразу можа заўважыць, што тут адбыліся значныя зьмены.

Рапей на заводзе было цмат непаладкаў. За работу машын ніхто не адказваў. Машына то запрацуе, то раптам спыняе сваю працу і стаіць гадзінамі бяз руху.

Дзесяткі тарфянікаў сядзелі ў сваіх бараках і спакойна пакурвалі. Раскавалі байкі пра розныя здарэньні свайго жыцьця, або жыцьця сваіх знаёмых. Дысцыпліна культала.

Займоўшы ў барак, можна было ўбачыць прагульшчыка, які, лежачы на ложку, высьвістаў малёдую якоўскі нудный песьні.

У бараках п'янкі...

Ніхто сур'ёзна ня думаў аб тым, што дзённае заданьне завод сыстэматычна ня выконвае, што завод падыйшоў да апошніх месяцаў сэзону з глыбокім прарывам.

58 проц. сэзоннага заданьня на 5-ае жніўня лічылі зусім нармальным зьявішчам.

* * *

Павіс над балотам туман...

Сумна пазбраюць высокія бурныя масывы складзенага ў штабэлі торфу. Сумным робіцца харканьне варон на краі суседняга лесу.

Гудкі машын штодзенна заклікалі на барацьбу, на ліквідацыю прарыву... Але прарыў пасьлыбляўся...

Дзе прычыны такога становішча? — пыталі некаторыя рабочыя.

— У нас кіраўніцтва расстаўлена рабочая сіла. Дрэнна арганізавана праца. Пры адной машыне працуе столькі рабочых, што яны не могуць вымысьліцца на адведзеных спэцыяльна мясцох, у той час, як на другой машыне не хапае 5-10 чалавек. Адміністрацыя на тагі, — адказвае ім лепшы ўдарнік торфазаводу — Палявікоў.

— А што вы чулі аб прамове т. Сталіна? Ці была прапрацавана сярод рабочых пастанова ЦК і СНК БССР аб торфараспрацоўках? — пыталіся рабочыя - брыгадзіры ў рабочых-тарфянікаў.

З месца падняўся высокі худанчавы ўдарнік — Іваноў Кандрат і адрывіста зазвіў:

— У нас на балоце аб гэтых дакументах маса рабочых яшчэ нічога ня ведае. Я чытаў іх. Я ведаю чаму мы ня выязім з прарыву. Я ведаю, — гаварыў і хваляваўся Іваноў Кандрат.

— Наша кіраўніцтва не перабудавала сваёй работы. Кіруе па-старымцы.

— У нас панує абязьлічка, ураўніраўка. Заводакіраўніцтва не змагаецца за зьдзельшчыну, за гаспадарчы разрахунак.

— Машыны часта прастойваюць, за гэта ніхто не адказвае.

— Механізацыя торфараспрацовак праводзіцца марудна.

— Нам торфарабкоп працуе дрэнна. Няма самых неабходных прамтавараў. Абеды сталовай дрэнная якасьці. У нашых бараках бруд, п'янка, культурнасьветная работа зводзіцца толькі да танцэрты з непатрэбнымі фокс-тротамі і г. д.

Рабочыя брыгады, друк прымусілі, нарэшце, загаварыць партыйную арганізацыю заводу.

Парт'ячэйка забіла трывогу.

Быў распушчан за бязьдзейнасьць торфком, даны адпаведныя паказаньні заводакіраўніцтву. Узяліся за распрацоўку прамовы тав. Сталіна і пастановы ЦК і СНК БССР аб торфараспрацоўках.

Зрабілі першыя кроці да работы пановаму.

Абвясьцілі дакладнік штурму прарыву. Пачалі барацьбу з абязьлічкай і ўраўнілаўкай.

Узьдзеньне зьдзельшчыны ўзьняло прадукцыйнасьць працы. Рабочыя брыгады пачалі выконваць і перавыконваць вызначаныя нормы торфаздабычы.

Узьнялася новая хваля творчага энтузіязму. Мацней націснулі рукі рабочых на лапаты. Зьмяніўся ход машын. Хутчэй закруціліся колы, якія прыводзяць у рух кампэер.

Чорная маса торфу шпарчэй прымасцца з лапат ударнікаў і кампэер на сваіх плячох нясе яе ў прэс. Адтуль выходзяць роўныя гладкія брусы сфармаванага торфу і накіроўваюцца на транспарцёр. Мацнее рух рук ударнікаў. Ежлікі ноч праз поўны прамежак часу, бліскоўўшы на сонцы, апускаецца на бясканцовы брус, расьсякаючы яго на шчаслівія цагліны. Гэтыя цагліны па дошках далёка ідуць ад машыны і павольні калышуцца на жалезных канатах транспарцёру. Там іх здымаюць рабочыя і засьцілаюць вялікую плошчу балота чорнай масай тарфяных цаглін.

Наперадзе брыгада Палявікова.

Брыгада Палявікова адзначаецца найбольшай дысцыплінаванасьцю. Барак гэтай брыгады адрозьніваецца ад іншых сваёй чыстатою, парадкам. Барак прыбраны зеляніню. Брыгада вечарамі доўга праседжвае за чытаньнем газэт і часопісяй, за абгаварэньнем раду хвалюючых пытаньняў і свайго прамфінпляну.

Брыгада кожны дзень выходзіць на працу з гармонікам.

— Мы дамо тэмпы, — гавораць ударнікі брыгады Палявікова.

І яны сапраўды даюць бальшавіцкія тэмпы работы, стаяць рэкорды для ўсіх астатніх брыгад.

Дзённая выпрацоўка — 36.000 цаглін.

У першы дзень штурму — 6 жніўня — брыгада дала 40 тысяч цаглін. На другі дзень — 46 тысяч, на трэці — 50 тысяч. Дзённае заданьне выконвецца звыш, чым на 183 проц.

За гэтыя перамогі брыгада атрымлівае сьцяг.

У дні штурму паказалі сваю працаздольнасьць і ўменьне змагацца за бальшавіцкія тэмпы работы і брыгады Васільева і Іванова Кандрата.

* * *

Камсамольская арганізацыя заводу дні штурму дабілася поўнага ахопу рабочых ударніцтвам і сацспабоўніцтвам. Разгарнулі культурна-масаную работу, арганізавалі некалькі ліквінктаў для тарфянікаў.

Насьцянгазэта з усёй рашучасьцю біла на прагульшчыкаў і разгільдзяяў, якія сваёй дэзарганізатарскай дзейнасьцю зрывалі заводзкі прамфінплян.

Іх ганьбавалі. У прыклад ставілі работу перадавых ударнікаў заводу і ўзоры работы лепшых брыгад Палявікова, Іванова і Васільева.

У выніку зьмянілися прагулы, сталі зусім рэдкімі факты п'янкі і надбанных адносін да работы.

Пералом быў зроблен. Крывая прамфінпляну пайшла ўгару...

* * *

Дні штурму падыйшлі да канца.

17 жніўня на ўсіх сараках разьвешаны вялізарныя аб'явы аб зьлёце ўдарнікаў.

Вялікімі літарамі напісана: «Сёньня заслухаем даклад дырэктара аб выніках дзекадніка штурму. Усе на зьлёт».

У 7 гадзін адкрыўся зьлёт ударнікаў.

Першым выступае дырэктар і радасна заяўляе:

— За 10 дзён штурму мы давялі процант выкананьня сэзоннага пляну да 74 проц.

У той час, калі мы за тры папярэдніх месяцы выканалі заводзкі прамфінплян на 68 проц., за гэтыя 10 дзён штурму мы далі 15 проц. сэзоннага заданьня. Гэтыя лічбы сьведчаць аб надзвычайных дасягненьнях у гэтыя дні, яна гаворыць аб поўнай магчымасьці ліквідаваць прарыў і па-бальшавіцку скончыць сэзон.

— Краіна чакае торфу і мы павінны яго даць, — канчае сваё слова дырэктар.

Настрой у тарфянікаў у гэты вечар быў узьнят, як ніколі. 15 проц. за 10 дзён выклікалі гарачыя выступленьні шматлікіх ударнікаў-тарфянікаў. Кожны з іх клікаў да далейшай барацьбы за торф, за заваёву новых перамог на тарфяным фронце.

Зьлёт ударнікаў адпагалосна прымае пастанову аб прадпрыняцьці штурму да канца сэзону.

Зьлёт выкінуў лёзунг:

— Ні адзін рабочы не павінен пакінуць заводу да канца сэзону!

— Ніводнага рабочага, які-б ня выканаў свайго заданьня!

— Мы павінны даць 25.300 тон торфу фабрыкам і заводам рэспублікі — крычыць Палявікоў!

— Мы дамо 25.300, — прагрымеў голас сотень рабочых торфазаводу!

П'ЕР ДЗЮКЛО

## ФРАНЦЫЯ „РАЗБРОЙВАЕЦЦА“

Шматтысячная армія рабськораў Саюзнага Саюзу прыняе дзейны, энэргічны ўдзел ва ўсіх галінах будаўніцтва нага быту, новага грамадзтва — у будаўніцтве сацыялізму ў рэспубліцы працы. Брыгады рабськораў ударна працуюць на фабрыках, на заводах, у саўгасах і калгасах. Рабськор ударнік — арганізатар мас. Яны зьяўляюцца лепшымі памочнікамі партыі і савецкага ладу.

На прыкладзе Савецкага Саюзу, і ў капіталістычных краінах вакол камуністычных газэт і рэвалюцыйных арганізацый, ня гледзячы на тэрор і прасьледваньні, паступова стварацца свой рабськораўскі актыў. Але задача рабськораў тая, вядома, некалькі іншая, чым задачы рабськораў у нас. Там рабкоры ўкрываюць падрыхтоўку капіталістычнай вайны супроць СССР, прапагандуюць пралетарскай рэвалюцыі ў рабочых і сялянскіх масах, вядуць барацьбу з заводах і на фабрыках супроць дзеяў і агентаў другога інтэрнацыянала... У многіх капіталістычных краінах (асабліва гэта адносіцца да Нямеччыны і да Францыі) рабськоры разгнулі вялікую работу.

Сёньнешні наш артыкул і базуецца гаўным чынам на матар'ялах, на выцьцях французкіх рабськораў, якія гнуюцца вакол «Юманіте» і вакол іншых камуністычных газэт Францыі.

Як «разбройваецца» французкі імпэрыялізм?

Слова даецца сёньня французкім рабкорам-карэспандэнтам.

* * *

Атрымаўся-б вельмі доўгі сьпіс, калі ўзяць усе паведамленьні і канфэрэнцыі, якія абіраліся за апошнія пад гады ў розных краінах і гарадох Эўропы і Амэрыкі па пытаньні аб разбраеньні, і пытаньні аб мэтадах барацьбы з вайнамі рэальнай небясьпекай новых вайн. Вашынтон, Гаага, Капны, Жэнэва — ды ці ўпамятаеш усё.

На ўсіх гэтых канфэрэнцыях і нарадах ліся патокі красамоўства буржуазных дэмоўцаў, прымаліся траскучыя рэзалюцыі выбіраліся бязьлікавыя камісіі і камісіі... Потым, нагаварыўшыся доволь, дзяржаўныя мужы капіталістычных краін адпраўляліся для... павялічэньня праз парляманты ваенных бюджэтаў, для яшчэ большых узбраеньняў.

Ці так гэта? На прыкладзе Францыі, якая асабліва пімат пытаецца аб сваім «міралюбстве», пастараемся даказаць гэта.

Вось напрыклад весткі аб ваеннай і так званай «грамадзянскай» авіяцыі Францыі. Мы сёньня асабліва падрабязна датыкнемся іменна гэтай галіны ўзбраеньня на той прычыне, што авіяцыя ў будучую вайну будзе іграць адну з важнейшых, адну з рашаючых на выніку вайны роляй.

Францыя больш чым якая-небудзь іншая дзяржава клапоціцца аб узрастаньні магутнасьці свайго паветранага флёту. Ужо цяпер паводле афіцыйных даных (усе лічбы ў гэтым артыкуле адносяцца да канца ліпеня і пачатку жніўня г. г.) яна распалагае трыма тысячамі ваенных аэраплянаў і гідраэраплянаў, і кожны дзень у строй яе паветранага ваеннага флёту ўступаюць усё новыя і новыя баявыя адзінкі.

На фабрыцы Ніепорт па вестках, атрыманых «Юманіте» ад яе рабкораў, цяпер выпускаюць новыя тыпы моноплянаў. На лётарынскіх фабрыках адбываюцца выпрабаваньні новых матораў у 700 конскіх сіл. У Віяанкуры нядаўна выпусьцілі новыя аэраплянны тыпу Ханрыо Л. Х. 43 з маторам у 240 конскіх сіл. Гэтыя аэраплянны адпраўлены ў 32 авіяцыйны полк у Дыжон. Праводзяцца выпрабаваньні новых санітарных аэраплянаў тыпу Л. Х. С. 21. Будуюцца новыя паветраныя апараты на фабрыках Кадэбек, Сартувіль і ў радсе іншых месц рэспублікі.

Узбройваючы свой паветраны флёт радам новых шпаркаходных апаратаў, Францыя не забываецца і аб узбраеньні сваіх васалаў у цэнтральнай Эўропе.

Мяркуючы па шматтысячных лістох рабкораў, фабрыкі Фарманы будуюць і адпраўляюць паветраныя апараты ў Югаславію, маторы тыпу «Лётарынгія» адпраўляюцца з Францыі на авіяцыйныя фабрыкі П. Ц. Л. і Баркеля ў Польшчы, другія авіяцыйныя маторы накіроўваюцца французкій у Румынію, Галандыю, Японію...

Францыя, на сэсіях Лігі Нацый, залівалася салаўём аб сваім хвалёным «міралюбстве», любіць іншы раз прадэманстраваць перад усім сьветам і сваю ваенную магутнасьць — у прыватнасьці магутнасьць усяго паветранага флёту. Так, напрыклад, з 25 па 29 ліпеня адбыліся ў Францыі (у раёне Нант) вялікія манэўры яе паветранага флёту. А 26 ліпеня пад старшынством міністра авіяцыі Дэвмесьніля адбылося ў Францыі сьвята ў гонар адкрыцьця новага аэрапорта ў Давіле. У часе гэтага сьвята таксама адбылася вельмі значная дэманстрацыя паветраных сіл рэспублікі.

Праўда, буржуазныя газэты Францыі тлумачыць усе гэтыя дэманстрацыі тым, што, моў, 23-24 ліпеня ў Нямеччыне (у Кісхафэне) адбываліся манэўры паветранага флёту і што яшчэ раней над Лёндонам манэўравала 300 ангельскіх аэраплянаў. Значыцца, моў, і Францыі адставаць не гадзіцца.

Што датычыцца да нас, то гэта пытаньне нам зусім ясна і зразумела, капіталістычны сьвет узбройваецца, ён ліхаманкава рыхтуецца да новых войн.

Супроць каго рыхтуецца ён ваяваць? Вядома, у першую голаву супроць краіны Саветаў, супроць краіны, якая пасьпяхова будуе сацыялізм.

* * *

Але паміма паветранага ваеннага флёту, Францыя яшчэ ўладае і вялізным, так званым грамадзянскім паветраным флётам. Мы гаварылі «так званым» таму, што гэты яе грамадзянскі паветраны флёт у выпадку абвяшчэньня вайны ў 24 гадзіны ператворыцца ў флёт ваенны. Вось чаму, гаворачы аб паветраных сілах Францыі нельга абыйсьці маўчаньнем і яе грамадзянскую авіяцыю.

Дык вось і ў гэтай галіне Францыя за апошнія гады дабілася вялізных посьпехаў. Французкая грамадзянская авіяцыя на працягу 1930 году перавезла ў розных часьці сьвету 52.000 пасажыраў, 3.520.000 кілё тавараў, 234.000 кілё пісьмо, часопісяй і газэт. За гэты год яна «пакрыла» каля 10.000.000 паветраных кілёмэтраў, г. зн. «пакрыла» адлегласьць, якая ў 28 раз перавышае адлегласьць ад Зямлі да Луны.

Гэтыя лічбы, гэтыя вялікія посьпехі французкай грамадзянскай авіяцыі гавораць самі за сябе. У часе-ж вайны усе гэтыя аэраплянны перастануць перавозіць турыстаў, газэты і часопісі. Замест гэтага яны зойміуцца перавозкай байцоў, ваеннай амуніцыі, бомб, гранат і газаў.

А паводле падлікаў, напрыклад, прафэсара французкага ўнівэрсытэта Поля Ланжэвэна, даволі ста аэраплянаў з адной тонай газавых бомб на кожным, каб пакрыць увесь Парыж газавай пялёной у дваццаць метраў таўшчыні. І калі ня будзе спрыяючага для расьсеваньня газаў ветру, то праз гадзіну ўсё жывое ў Парыжы будзе зьнішчана.

Вось такой страшэннай, сьмяротнай зброяй зьяўляюцца гэтыя стальныя пушкі, начыненыя газавымі бомбамі, узброеныя кулямётамі і гранатамі. Вось чаму пры вызначэньні ступені балздольнасьці (у часе вайны) французкага (дый ня толькі аднаго французкага) паветранага флёту патрэбна прымаць пад увагу ня толькі яе ваенную авіяцыю, але і авіяцыю грамадзянскую.

Наколькі разьвіваецца хэмічная індустрыя ў Францыі — якімі гігацкімі крокамі ідзе там выпрацоўка для ваенных мэт атрутных матэрый, можна пабачыць з наступных даных.

Да 1924 году «Анаімнае таварыства па хэмічнай прадукцыі ў «Сэн-Дэні» было найбольш вялікай фабрыкай хэмічных вырабаў у Францыі. Яно ўладала 10.000.000 франкаў капіталу. Да канца 1922 г. на гэтай фабрыцы працуе ўжо 1200 рабочых, яе капітал раўны ўжо нечакана дзесятком мільёнаў франкаў.

У Тулузе азотная фабрыка, якая каштавала дз

НАСУСТРАЧ НАВУЧАЛЬНАМУ ГОДУ

# ПРАЗ 4 ДНІ ПАЧНЕЦЦА ВУЧОБА

## СТАРШЫНІ ЦЕРАХАУСНАГА, ХОЙНІЦКАГА, УВАРАВІЦКАГА І ЧАЧЭРСКАГА РАЙВЫКАНКОМАЎ САРВАЛІ ПАДРЫХТОЎКУ

Двухдэкаднік трывогі па падрыхтоўцы да новага навучальнага году вызвіў шмат прарываў па 18 раёнах Гомельшчыны. Рад раённых організацый і работнікаў спадзяючыся на самацёк, не аддаваў адпаведнай увагі падрыхтоўцы да новага навучальнага году.

Старшыні **Церахаўскага, Хойніцкага, Уваравіцкага, і Чачэрскага** РВК заявілі: «Работу двухдэкадніка можаце праводзіць, а людзей на дапамогу ў нас няма», або «двухдэкаднік — гэта глупства» (Парыцкі раён).

З боку інспектароў асьветы назіраюцца недапушчальныя адносіны да падрыхтоўкі да новага навучальнага году. На пытаньне чаму ў вас няма работы, Камарынскі райінспектар кажа: «Чакаю, пакуль мяне зрыпцуюць за бяздзейнасьць». Лоеўскі інспектар абсалютна не видзе работы на працягу 3-х месяцаў. Веткаўскі райінспектар ня ведае, колькі ў раёне будуецца школ.

Замест практычнай дапамогі ў праведзеньні двухдэкадніка трывогі, інспектары некаторых раёнаў у гэты час скарыстоўваліся не па прызначэньні. Рэчыцкі інспектар у часе двухдэкадніка працаваў у міліцыі. Жлобінскі палітінспектар — загадчыкам хаты-чытальні.

З 19 раёнаў у 6 ня створаны саветы культбудаўніцтва і ў 10 раёнах няма адзінага культпляну. **Па 6 раёнах не праведзен вучот няпісьменных і малапісьменных.**

Над будаўніцтвам новых школ нависла рэальная пагроза зрыву. У гэтай галіне ганебна адстаюць **Петрыкаўскі, Жлобінскі, Чачэрскі, Рэчыцкі, Буда-Кашалёўскі і Ельскі раёны.**

Дрэнна стаіць справа з забесьпячэньнем школ кадрамі. У 18 раёнах па першым канцэнтры не хапае 583 асобы, па другім канцэнтры—146, па трэцім—9. Ёсьць выпадкі, калі настаўніцтва скарыстоўваецца не па спэцыяльнасьці.

Па некаторых раёнах недапушчальна дрэнна стаіць справа з забесьпячэньнем школ абсталяваньнем. Патрэбуецца 5.500 школьных лавак, а зроблена толькі 1.230. У **Жлобінскім, Мазырскім, Тураўскім, Лоеўскім, Веткаўскім, Церахаўскім і Ельскім раёнах,** ня зроблена ніводнай лаўкі.

Шмат дапрыгыўнікаў нараджэньня 1909 г. застаецца няпісьменнымі і ніякай работы сярод іх не праводзіцца (**Церахаўскі, Петрыкаўскі, Жлобінскі, Камарынскі і Веткаўскі раёны**). Ня лепш справа з ліквідацыяй няпісьменнасьці і сярод рабочых сэзонынікаў.

Значна лепш стаіць справа з ліквідацыяй няпісьменнасьці па гор. **Гомелі,** які абвясьціў штурм на ліквідацыю няпісьменнасьці да 1 кастрычніка з такім разьлікам, каб у гэты тэрмін усе прадпрыемствы гораду зрабіць суцэльна-пісьменнымі.

Забесьпячэньне школ падручнікамі і пісьмовымі прыладамі, вопраткай, гарачым сьнеданьнем і інш. па радзе месц стаіць нездавальняюча.

Шмат дзяцей рабочых знаходзіцца па сёнешні дзень па-за сьцэнамі дашкольных устаноў, з-за адсутнасьці сродкаў і памяшканьняў (гор. Гомель).

Вышэй пададзеныя факты па радзе месц ставяць над пагрозу новы навучальны год. Патрэбна сурова пакараць работнікаў РВК і інспектароў, якія злачынна зрываюць падрыхтоўку да новага навучальнага году.

Ш—а.

## АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА
### АБ СТАНОВІШЧЫ ДРУКАВАНЬНЯ І ПЕРАСЫЛКІ ПАДРУЧНІКАЎ ДЛЯ ШКОЛ НАЦМЕНШАСЬЦЯЙ

| ПАДРУЧНІКІ | Беларускае Дзяржаўнае выдавецтва | | | Расійскае выдавецтва | | | Украінскае выдавецтва | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Патрэбна | Дасланa | У друку | Патрэбна | Дасланa | У друку | Патрэбна | Дасланa | У друку |
| 1. Яўрэйскія | 13.000 | 7.900 | 4.305 | 2.500 | 877 | 1.628 | 1.195 | 297 | 393 |
| 2. Польскія | 5.875 | 3.676 | 2.199 | 2.299 | 838 | 1.361 | 6.344 | 733 | 5.611 |
| 3. Латыскія | — | — | 2 | 503 | 178 | 325 | — | — | — |

**Увага:** Па віне Наркамасьветы і Цэнтрвыдавецтва, заказ на літоўскія падручнікі ня зроблен. Школы застаюцца без падручнікаў.

КАРМАВУЮ БАЗУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

# ЗАПОЎНІЦЬ СІЛАСНЫЯ ЯМЫ

## 265.000 кмб. сіласных ям, траншэй і веж не скарыстаны

### У БЯГОМЛЬСКІМ, ВУШАЦКІМ, ДУБРОВЕНСКІМ і ПУХАВІЦКІМ РАЁНАХ СІЛАСАВАНЬНЕ НЯ ЗРУШЫЛАСЯ ЎПЕРАД

### РУЙНУЮЧЫ АДПОР АПАРТУНІСТАМ, ЯКІЯ ЗРЫВАЮЦЬ СТВАРЭНЬНЕ КАРМАВОЙ БАЗЫ У ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ ГАСПАДАРКАХ

Весткі Наркамзему аб ходзе сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня па БССР на 20 жніўня выклікаюць небясьпеку за спазчасовасьць выкананьня пляну.

Да 1 верасьня плян сіласаваньня павінен быць выкананы на 65 проц. Між тым, на 20 жніўня **МЫ МАЕМ УСЯГО 4,1 ПРОЦ. ВЫКАНАНЬНЯ ЗАДАНЬНЯ.** Апошняя дэкада на дзень амаль ніякага зруху—**ЗА 10 ДЗЁН ВЫКАНАНА УСЯГО 1,2 ПРОЦ. ПЛЯНУ СІЛАСАВАНЬНЯ.**

Ня лепш і з сіласным будаўніцтвам, якое павінна было быць ужо закончана. На справе-ж мы маем выканальне ўсяго 17,4 проц. пляну сіласнага будаўніцтва. Пабудавана сіласных веж, ям і траншэй—347.883 кбм.

**АЛЕ І ПАБУДАВАНЫЯ СІЛАСНЫЯ ЯМЫ І ТРАНШЭІ ПУСТУЮЦЬ. 265.000 КБМ. СІЛАСНЫХ ВЕЖ, ЯМ І ТРАНШЭЙ НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ НЕ СКАРЫСТАНЫ.**

Гэта ў той час, калі ў радзе раёнаў сіласныя культуры, як слажэчнік і кукуруза ўжо пасьпелі і ня ўбіраюцца. У **Вушацкім, Бягомльскім, Пухавіцкім і Дубровенскім** раёнах слажэчнік ужо пасьпеў і нават перасох, чым траціць сваю спажыўнасьць. Ня гледзячы на гэта, у паказаных раёнах сіласаваньне **НЯ РУШЫЦЦА ЎПЕРАД.** Выкананьне пляну ў гэтых раёнах пістаецца ад 1,5 да 6,7 проц.

У радзе калгасаў гэтых раёнаў ёсьць імкненьні наогул не займацца сіласаваньнем.

Такія апартуністычныя спробы сарваць сіласаваньне павінны атрымаць безадкладна самы руйнуючы адпор. Райвыканкомы і раікалгасаюзы павінны безадкладна прыцягнуць да адказнасьці старшынь калгасаў, якія зрываюць сіласаваньне.

Трэба безадкладна ўсталяваць апэрацыйнае кіраўніцтва і кантроль ходу сіласаваньня ў кожным калгасе, у кожным сельсавеце.

Жнівень і верасень рашаючыя месяцы сіласаваньня. Калгасы і саўгасы павінны памятаць, што сілас будзе займаць значнае месца ў кармавым балансе. Таму вылучаньне спэцыяльных брыгад з калгасьнікаў і саўгасных рабочых па капальні ям і сіласаваньні зьяўляецца зараз першачарговай задачай кожнага калгасу і кожнага саўгасу.

У бліжэйшыя-ж дні трэба дабіцца карэннага пералому як у ходзе сіласнага будаўніцтва, так і сіласаваньня.

Камсамол, які дагэтуль быў у ролі пасыўнага назіральніка — павінен выйсьці ў першыя рады змагароў за сілас і ўзяць на буксір адстаючыя саўгасы, калгасы і сельсаветы.

### Зборку веж зрушыць уперад

Будаўніцтва сіласных веж па саўгаснай і калгаснай сыстэме БССР праходзіць зусім нездавальняюча.

Паводле пляну ў калгасах БССР выз пачана пабудаваць 197 веж. Між тым на сёнешні дзень у калгасы завезена 42 вежы. Фундаманты для завезеных веж таксама ўжо пабудаваны. Рабочай сілай і мясцовымі матар'яламі будаўніцтва забясьпечана. Ня гледзячы на гэта, на сёнешні дзень пабудаваны толькі 2 вежы. 29 веж знаходзіцца ў стадыі зборкі. Рэшту веж яшчэ не пачалі будаваць.

У саўгасах Белсаўгастросту з 48 сіласных веж, на сёнешні дзень пабудаваны толькі 5. Будуецца 27. 18 сіласных веж яшчэ не пачаты пабудовай. Белсельбуд з 61 вежы закончыў толькі 21.

Паказаныя вышэй лічбы з усёй выразнасьцю гавораць аб апартуністычнай недаацэнцы значэньня сіласаваньня і сіласнага будаўніцтва. У радзе калгасаў і саўгасаў разважаюць аб тым, што «сіласнае будаўніцтва наогул непатрэбна, бо кармоў хопіць і без сіласу». У выніку завезеныя вежы не зьбіраюцца і не захоўваюцца. Бываюць выпадкі, калі вежы скарыстоўваюцца зусім не па прызначэньні.

Камісія выкананьня пры СНК БССР павінна праверыць ход будаўніцтва сіласных веж і прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у зрыве сіласнага будаўніцтва.

Н. Марчук.

### „Корму хопіць і без сіласу"

**ПУХАВІЧЫ.** У саўгасе **«ВЯЛЕНЬСІНЧА»** яшчэ ня прыступілі да сіласаваньня. У аддзяленьні «Вялень» выкапана сіласная яма, а ў аддзяленьні «Сінча» пабудавана вежа.

Бульбнік ужо пасьпеў, але адміністрацыя саўгасу лічыць што корму хопіць і без сіласу, таму няма чаго сьпяшацца з сіласаваньнем.

У аддзяленьні «Сінча» ёсьць добрая траншэя, якая патрабуе рамонту. Між тым адміністрацыя саўгасу аб гэтым ня думае.

Патрэбна зламаць апартуністычныя адносіны адміністрацыі саўгасу да сіласаваньня. Яма і вежа павінны быць зараз-жа запоўнены сіласам.

Брыгадзір «Зьвязды» МАЗАЛЕЎСКІ.

### Ходзяць без работы, а за сіласаваньне не бярэцца

**БЯГОМЛЬ.** У **Мсьціскім, Нядольскім і Іканскім сельсаветах** Бягомльскага раёну дагэтуль не засілавана ніводная тоны зялёнай масы.

У калгасе «Беларусь» Мсьціскага сельсавету, ёсьць лішкі рабочай сілы, калгасьнікі ходзяць бяз працы, а за сілас не бярэцца.

Камсамольскія ячэйкі сельсавету неда ацэньваюць важнасьці сілосу і не праяўляюць ініцыятыву.

Патрэбна ўдарыць па апартуністах, якія разважаюць аб тым, што «сілас не дае карысьці» і зрушыць уперад сіласаваньне РК ЛКСМБ павінен зацікавіцца работай камсамольскіх ячэек.

Калгасьнік.

### СІЛАСНЫЯ ТРАВЫ У ЯМЫ

**ДУБРОЎНА.** У калгасах Бельскага сельсавету сіласаваньне ня зрушылася з месца. Пасенныя сіласныя травы стаяць на полі і не ўбіраюцца. Калгасы нават ня рыхтуюцца да ўборкі іх.

Чарняўскі.

***

**ЛЕЛЬЧЫЦЫ.** У калгасе **«ПРАГРЭС»** да гэтага часу не засілавана ніводная тоны зялёнай масы. Сіласныя травы ўжо перасталі і страцілі сваю спажыўнасьць, якую яны маглі даць пры своечасовым скарыстаньні.

М.

### Силасьці кармавы баланс

**КОЙДАНАВА.** Саўгас імя Сталіна, Койданаўскага раёну своечасова скончыў уборку сенажацяй. Нахошана 569 тон сена. Але захоўваецца яно надзвычайна дрэнна. Стрэхі і шчыты ў пунях падраныя. У выніку частка сена прамокла і пачала гніець.

Саўгас павінен засілаваць 919 тон, пакуль закладзена ўсяго 100 тон — 11 проц.

Для закладкі такой масы сілосу няма ям. Ёсьць толькі вежа на 800 тон. На рэшту сілосу трэба будаваць і рамантаваць ямы і траншэі, але да гэтых работ саўгас ня прыступаў.

**Кармавы бэпянс у саўгасе не складзен і невядома, ці хопіць для жывёлы грубых кармоў.**

Брыгадзір «Зьвязды» САНЦЭВІЧ.

### Кармоў не хапае, а сілас ігнаруюць

**ВУШАЧЫ.** У **Гарбацэвіцкім** сельсавеце сіласаваньне выкананa на 10 проц. Пераважная частка калгасаў бязьдзейнічае і нічога не зрабіла для сіласаваньня. Толькі адзін калгас **«КАМУНАР»** закладзіў 15 тон сілосу.

**Праўленьні калгасаў ведаюць аб тым, што ў іх кожны год не хапае кармоў, але-ж за сіласаваньне не бярэцца.**

КАЛГАСЬНІК.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку"

АГЛЯД ДРУКУ

# МІМАХОДАМ

## „КАЛГАСЬНІК КАПЫЛЬШЧЫНЫ" „ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ"

**КАПЫЛЬСКІ** раён уступіў у збожжазагатоўчую кампанію зусім не падрыхтаваным. Раённыя арганізацыі недаацэнілі выключнай важнасьці.

«...пасьпяховага правядзеньня збожжазагатовак у гэтым годзе як у сацыялістычным, так і ў аднаасобным сэктары сельскай гаспадаркі», (З пастановы ЦК УсеКП(б) аб збожжазагатоўках).

Усе зьвенні загатоўчага апарату былі засьцігнуты зьнянацку. Прыбывалі першыя чырвоныя абозы са збожжам, а райспажыўсаюз і райкаапсаюз займаліся бюракратычнымі спрэчкамі аб тым, каму перадаць склады. Склады, між іншым, ня былі адрамантаваны і гатовы да прыёму збожжа.

Ніхто ў раёне ня думаў аб мабілізацыі тары для збожжазагатовак. Сапраўдны рэкорд бязьдзейнасьці набіў райспажыўсаюз, загатовіўшы за ўсю вясну і лета... 80 мяшкоў. Месячнік абору тары па ўсіх раённых арганізацыях быў правалены. Загатоўчы апарат і да гэтага часу работнікамі не ўкамплектаваны. Склады і прыёмачныя пункты з-за дрэннай падрыхтоўкі не спраўляюцца са сваёй работай. Масава-растлумачальная работа сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў у раёне не разгорнута.

Словам, збожжазагатоўкі ў Капыльшчыне з самага пачатку былі пакінуты на волю самацёку. За зрыў падрыхтоўчай работы адказваць ня толькі капыльскія кіруючыя арганізацыі. Віна за такое зусім нецярпімае становішча ляжыць і на раённай газэце **«КАЛГАСЬНІК КАПЫЛЬШЧЫНЫ».**

Удзел «К. К.» у збожжазагатоўках зводзіцца літаральна да нуля. «Калгасьнік Капыльшчыны» не знайшоў нават патрэбным апублікаваць пастановы ЦК УсеКП(б) аб збожжазагатоўках.

Да 11 жніўня, як гэта ня дзіўна, газэта не вымясьціла ні аднаго радка, прысьвечанага загатоўчай кампаніі. 15-дзеньнік праверкі падрыхтаванасьці да збожжазагатовак у газэце **НЕ ЗНАЙШОЎ** патрэбнага адлюстраваньня.

Толькі 11 жніўня «Калгасьнік Капыльшчыны» быў вымушан, нарэшце, парушыць сваё глыбокае маўчаньне. Іменна вымушан пад напорам магутнай ініцыятывы калгасных мас, якія, усьведамляючы вялізарнае палітычнае значэньне збожжазагатовак, абвясьцілі сябе ўдарнікамі загатоўчай кампаніі і высунулі сустрэчны загатоўчы плян. Кантрольную лічбу загатовак калгасы павялічылі на 15 проц. Калгасьнікі Капыльшчыны зьвярнуліся праз «Зьвязду» да ўсіх калгасаў БССР з адозвай, у якой заклікаюць іх поўнасьцю і датэрмінова здаць збожжа дзяржаве, забясьпечыўшы часьпяховае правядзеньне збожжазагатовак у аднаасобным сэктары.

Атрымаўшы гэту адозву, рэдакцыя «Калгасьніка Капыльшчыны» зьмясьціла яе ў газэце 11 жніўня, дадаўшы ад сябе некалькі агульных фраз:

«Збожжазагатоўчая кампанія ў гэтым - трэцім рашаючым годзе пяцігодкі—набывае выключнае значэньне. Ад яе посьпехаў залежыць посьпех усяго сацыялістычнага будаўніцтва. Настойлівасьць, максымальна ўшчыльненыя тэрміны, прыдзяленьне ў баявую гатоўнасьць усяго, што вырашае посьпех кампаніі (тара, склады, перавозачныя сродкі, узмацненьне збожжазагатоўчага апарату кадрамі і г. д.), шырока праведзеная масава-растлумачальная работа сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, бязьлітасны адпор кулацкай дзейнасьці і агітацыі—умовы, якія забясьпечаць посьпех надыходзячай (для газэты толькі надыходзячай)! збожжазагатоўчай кампаніі».

Далей рэдакцыя, правільна канстатуючы, што

«...гэты піст (адозва рэд.) ня проста гук, ня пусты кавалак паперы, а дакумант вялікай палітычнай важнасьці...»,

Папярэджвае:

«ён абавязвае нас—яго аўтараў—калгасьнікаў Капыльшчыны надта многаму (якая канкрэтнасьць!)».

На гэтым «Калгасьнік Капыльшчыны» паставіў крыжык. Газэта забыла, што адозва калгасьнікаў накладае пэўныя абавязацельствы і на самую рэдакцыю.

Апублікаваўшы адозву, «Калгасьнік Капыльшчыны» парашыў, што ўсё ўжо зроблена. Ніякай арганізатарскай і масавай апэрацыйнай работы газэта не разгарнула. Газэта ня стала на чале ініцыятывы калгасьнікаў.

У наступным нумары ад 19 жніўня «Калгасьнік Капыльшчыны» зноў ні адным словам не ўспамінае пра збожжазагатоўкі. Напэўна, «Калгасьнік Капыльшчыны» лічыць, што яго роля ў збожжазагатоўках поўнасьцю вычарпана зьмяшчэньнем адозвы калгасьнікаў. Відаць, рэдакцыя «К. К.» думае, што адозва «абавязвае надта многаму» толькі калгасы, але зусім не самую газэту.

***

Слуцкі **«ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ»** у перадавым артыкуле 16 ліпеня зусім правільна завастрае ўвагу раённых арганізацый па неабходнасьці

«ПЛЯН УБОРКІ ЎРАДЖАЮ ЗЛУЧЫЦЬ З ПЛЯНАМІ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК. Пытаньні тэрмінаў абмалоту, інвэнтару, цягавай сілы трэба абавязкова ўвязаць са збожжазагатоўкамі».

Працягнуць пачатую справу, разгарнуць упартую і сыстэматычную барацьбу за часьпяховае правядзеньне збожжазагатовак, — такая была задача рэдакцыі газэты.

Аднак, «Л. Ш.» трымаўся некалькі іншай думкі. Рэдакцыя налічыла магчымым арабіць 20-дзённы перапынак. На працягу 2-х дэкад газэта захоўвае дзіўнае маўчаньне, нібы ў раёне няма ніякіх збожжазагатовак.

Між тым, на Случчыну ў галіне збожжазагатовак ускладзены вялікія задачы. Сама рэдакцыя «Л. Ш.» чакае 20-дзённага маўчаньня адзначае, што:

«... згодна дырэктывы партыі, загатоўкі ў радыусе 35 клм. павінны паступаць да перавозачнага пункту. Тэмп чынам, праз Случак павінна прайсьці загатоўка ад 4-х раёнаў па прыблізных даных ня менш 10 тыс. тон. Складаў-жа ў Случку ёсьць на 2.500 тон».

З недапушчальным спазьненьнем газэта б'е трывогу:

«Ужо рушылі з масы, з калгасаў першыя чырвоныя абозы з хлебам сэзона ўраджаю. Але гэты хлеб паступае стыхійна. У ходзе загатовак не адчуваецца арганізатарскай ролі загатоўчых арганізацый, у першую чаргу РАЙКААПСАЮЗУ. У самацёчным паступленьні хлеба адчуваецца значнае спазьненьне з АРГАНІЗАЦЫЯЙ хлебазагатовак».

Дзе-ж была рэдакцыя «Л. Ш.» раней? Чаму яна не разгарнула своечасовай барацьбы з бязьдзейнасьцю раённых загатоўчыкаў.

«Ленінскі шлях» — фіксатар фактаў, а не арганізатар мас.

***

Раённыя газэты БССР абавязаны неадкладна разгарнуць баявую работу па арганізацыі і правядзеньні збожжазагатовак. Раённыя газэты павінны ўлічыць, што яны таксама адказваюць за посьпех збожжазагатовак побач з кіруючымі і загатоўчымі арганізацыямі раёнаў. Задача раённага друку — дабіцца поўнага ажыцьцяўленьня лёзунгу: «НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ».

ІНЖЫНЭР С. М. ВІШНЕЎСКІ

# БАР'ЕРЫ БУДАЎНІЦТВА НА „ГЕРОІ ПРАЦЫ"

Амаль год, як чырвонасьцяжная папяровая фабрыка «Герой працы» ня выходзіць з ганебнай дошкі прарываў. З кожным днём павялічваецца запазычанасьць фабрыкі краіне. За першае паўгодзьдзе фабрыка выканала толькі 27,5 проц. пляннавага заданьня па паперы і 24,2 проц. па саламянай цэлюлёзе — па асноўным сваім паўфабрыкаце.

Фабрыка «Герой працы» зьяўляецца адной з самых буйных папяровых фабрык у СССР і буйнейшым прамысловым прадпрыемствам у БССР. Удзельная вага гэтай фабрыкі ў выпрацоўцы культурных (для пісаньня і друкаваньня) гатункаў паперы вельмі высокая, яна складае 7,31 проц. Ад работы фабрыкі «Герой працы» залежыць дзейнасьць многіх выдавецтваў і ў першую чаргу беларускіх. У апошнія гады фабрыка значна абноўлена ў тэхнічных адносінах, асабліва ўзмоцнена парасілавая гаспадарка.

Фабрыка мае вялікі запас мясцовага апалу — торфу. Магчымасьці вялікія, зусім выстарчальныя, каб фабрыка з посьпехам выконвала свой прамфінплян — 110 тон «культурнай» паперы ў суткі.

У чым-жа прычына ганебнага прарыву? У апартуністаў выступаюць на сцэну так званыя «аб'ектыўныя прычыны»: раней (вінаў) — адсутнасьць апалу, потым (увесну) — паводка, цяпер (летам) — недахват рабсілы і ў матар'ялах, а на восень некаторыя патэнтаваныя ніцкі рыхтуюць новы арсэнал «аб'ектыўных прычын» — дажджы, сьнег, мокры торф і г. д.

Вядома, нельга адмаўляць уплыву ў пэўнай ступені гэтых «аб'ектыўных прычын» у мінулым, але толькі ў пэўнай ступені. На сёньня-ж на фабрыцы няма «аб'ектыўных прычын» — ёсьць толькі суб'ектыўныя прычыны ўнутранай нераспарадчасьці, якая засталася ў спадчыну ад старога апартуністычнага кіраўніцтва фабрыкі.

Аналіз прарыву ў бягучым годзе з поўнай відавочнасьцю пераконвае ў тым, што адной з асноўных прычын яго зьяўлялася і зьяўляецца хаос у новым будаўніцтве. Фабрыка знаходзіцца ў стадыі «пэрманэнтнай рэканструкцыі» ўжо сёмы год, прычым вызначыць пачатковы момант яе і прадугледзець канчатковы пры сучасным становішчы будаўніцтва немагчыма.

Першыя кроўі рэканструкцыі былі пакладзены ў 1924 годзе яшчэ палескім трэстам, які прыступіў да бясплянавага будаўніцтва будынкаў, большай часткай ня ведаючы для чаго, для якога вытворчага працэсу ён гэтыя будынкі будуе. Таму, напрыклад, корпус, узведзены для пабудовы клеяварачнага і глінаразводчанага аддзелаў прышлося перарабляць на-ходу, прыстасоўваючы пад новы цэлюлёзны завод. Некаторыя пабудовы, як памяшканьне, занятае зараз пад часовае каусьцізацыйнае аддзяленьне, наогул ня мелі ніякага прызначэньня.

Толькі ў 1927 годзе прыступілі да афармленьня новага будаўніцтва, калі быў складзен плян рэканструкцыі фабрыкі «Герой працы», які прадугледжвае ўстаноўку шасьцімагутнай паперарабочай машыны, поўнае перааблаціваньне падрыхтоўчага і рольнага аддзелаў і пакамэры, будаўніцтва буйнога на сваім маштабе саламяна-цэлюлёзнага заводу і поўную рэарганізацыю парасілавай гаспадаркі на базе выкарыстаньня мясцовага апалу — торфу. Поўнае скончаньне рэканструкцыі прадугледжвалася ў 1930 годзе.

З вызначанага пляну засталося нявыкананым будаўніцтва новага саламяна-цэлюлёзнага заводу, астаняя-ж перабудова фабрыкі ў вялікай ступені ажыцьцёўлена.

Але як? Якая якасьць новага будаўніцтва? Вось у гэтай частцы далёка ня ўсё добра.

Пачнем а парасілавай станцыі, якая з'яўляецца сэрцам вытворчасьці, ад правільнай работы якой залежыць дзейнасьць усёй фабрыкі, ці вярней камбінату.

Будаўніцтва новай парасілавай станцыі, зусім сучаснай па тыпу свае абсталяваньня, і правядзеньне штодзённай канатнай дарогі для дастаўкі торфу з распрацовак торфазаводу «Шлях сацыялізму» (адлегласьць каля 7 кілёмётраў) вялося контр-агентамі, Энэргабудам і Трансбудам з удзелам раду будаўнічамантажных кантор і прадстаўнікоў заменных фірм. І трэба сказаць, што гэтая частка будаўніцтва ў агуле выкапана здавальняюча і непаладкі, якія ёсьць у часьці наладжваньня работы станцыі і тэрміну выкананьня, у значнай меры тармазілася фабрыкай. Даводзі сказаць, што поўнае выпрабаваньне новай сілавой станцыі і па гэты час затрымліваецца адсутнасьцю выстарчальнага запасу ў канцэльных бункерах добраякаснага торфу.

На гледзячы на тое, што першаклясна абсталяваная парасілавая станцыя гатова і падвесная дарога працуе большмеш здавальняюча, штодзённа здаравоцца перабоі ў рабоце станцыі, штодзённа прастойваюць гадзінамі вытворчыя агрэгаты з-за недахвату энэргіі, а часта і пары. Штодзённа краіна недаатрымлівае 40-60 тон вострa-дэфіцытнай паперы, чым тармозіцца справа культурнай рэвалюцыі. Прычыны дрэннай работы станцыі ў дрэнным забясьпячэньні яе торфам. Торф падаецца пяроўнамерна і ў колькасных і ў якасных адносінах.

Пабудаваўшы ў лепшым эўрапэйскім стылі падвесную канатную дарогу коштам у 1.300 тыс. руб., новае будаўніцтва не пакланацілася аб пабудове жыльлёвых памяшканьняў (2-3 дамоў) для рабочых торфапагрузачнай станцыі. Да гэтага дня там няма ніводнага пабудаванага зімовага дому. Адсутнічае прыгодная для пітьця вада і інш.

Гэта ігнараваньне «дробязяй» вытворчых і бытавых вельмі характэрна для для ўсёй работы новага будаўніцтва. Таму, напрыклад, пабудаваны 12-кватэрны дом для ІТР з галандскімі печамі, хаця амаль адначасова пабудаваны будынак школы ФЗВ, які зьмяшчаецца побач, абсталёван паравым ацяпленьнем. Таму ў гэтым-жа доме вадаправод у некаторых кватэрах, дзякуючы дасьціпнай тэхнічнай сваёй «дасканаласьці» працуе толькі на «дванадзесятых сьвятах».

Але пяройдзем да асноўнага.

Рэканструкцыя і пашырэньне папяровага аддзелу, якія офіцыяльна закончаны яшчэ паўтары гады назад, фактычна адчуваю сапраўдную патрэбу ў рэканструкцыі.

Зроблена перааблаціваньне рольнага аддзелу і клеяваркі ні ў якай меры не забясьпечвае нармальнай работы фабрыкі, бо трэба проста сказаць, што інтарэсы вытворчасьці, рацыяналізацыя тэхналёгічнага працэсу ня былі выстарчальна ўлічаны. Апаратура расстаўлена нязручна, без неабходных праездаў і праходаў, не захаваны нормы асьвятленьня і г. д.

Галоўнае-ж, зусім адсутнічае ажыцьцяўленьне двух асноўных прынцыпаў сучаснай папяровай вытворчасьці: мэханізаванай заладкі валакна ў ролы ў вадкім выглядзе і падзельнага намолу валакна. У сучасны момант рольнае аддзяленьне Добрускай фабрыкі—адно з вузкіх месц на вытворчасьці. Тое-ж трэба сказаць аб клеяварцы і цэлараводцы, якія ўстаноўлены вельмі няўдала і вельмі цесна.

Значнае папырэньне вытворчай магутнасьці папяровай фабрыкі выклікана ўстаноўкай магутнай пераборачнай машыны № 6. На жаль машына, уціснутая ў загадзя пабудаванае, без дакладнага ўліку габарытных разьмераў апаратуры, памяшканьне, працярпела арганічную апэрацыю ўкарочваньня сетачнай часткі. Няправільны выбар тыпу дапаможных варштатаў (перакатнага і рольна-рэзальнага), аддзелачных машын і іх устаноўка зусім выключаюць нармальную схэму руху паперы для канчатковай яе аддзелкі і, вядома, выклікаюць значныя затрудненьні ў рабоце машыны.

У ліпені 1931 году спэцыяльная камісія Саюзпаперы прызнала неабходным у бліжэйшы-ж час прыступіць да поўнай рэканструкцыі і аддзелачнага аддзяленьня для прадукцыі машын № 5 і 6, в мэтаю стварэньня правільнага вытворчага працэсу і правільнага грузапатоку.

Няпляннавае (вярней, бясплянавае, без дазволу адпаведных органаў) будаўніцтва памяшканьня новай хэмічнай кладоўні шчыльна да пакамэры было зусім перапляньнальна і па пастанове тэйжа камісіі для хэмічнай кладоўні неабходна адшукаць іншае памяшканьне, а гэты новы будынак павінен быць прыстасаваны для разьмяшчэньня аддзелачных машын, якія абслугоўваюць папяровыя машыны.

Пяройдзем да будаўніцтва новага саламянага цэлюлёзнага заводу, дзе з выключнай яркасьцю выступаюць усе асноўныя недахопы арганізацыі праектных і будаўніча-мантажных работ на новым будаўніцтве.

Гэта будаўніцтва працягваецца ўжо 7 год. На працягу толькі 1931 г. указваліся наступныя тэрміны скончэньня яго: 1 студзеня, 15 красавіка, 15 чэрвеня, 1 верасьня, 15 кастрычніка і, нарэшце, студзень 1932 году.

А пакуль-што імпартнае абсталяваньне, коштам каля 200.000 руб. не скарыстоўваецца і ляжыць мёртвым капіталам. Кожны дзень адтэрмінаваньня пуску заводу на яго поўную праектную магутнасьць абыходзіцца краіне ня менш 1.500 руб. Толькі за 1931 год папяровая прамысловасьць СССР вымушана была з-за зрыву будаўніцтва Добрускага саламяна-цэлюлёзнага заводу выдаткаваць звыш паўмільёна рублёў, г. зн. коштам маскутнай паперавырабляючай машыны.

Хаця будаўніцтва працягваецца 7 год, але на сёнешні дзень будоўля не забясьпечана поўнасьцю нават агульнымі праектамі чарцяжамі, не гаворачы ўжо аб рабочых чарцяжох.

Аб такіх важнейшых часьцях завода, як склады саломы з мэханізацыяй іх пагрузкі і разгрузкі і мэханізацыі транспарта саломы ў вытворчасьці, у праекце няма ніякіх указаньняў.

Каб уясьніць сабе асобную важнасьць правільнага і своечасовага вырашэньня гэтай праблемы, даводзі сказаць, што гадавы запас прэсаванай саломы складае каля 40 тысяч тон (прыкладна 350.000 куб. мэтраў карыснага аб'ёму), г. зн. пры загатоўчым перыядзе 100 дзён будзе паступаць у склады 400 тон саломы ў суткі, ці чыгуначны склад у 60 вагонаў. Штодзённа павінна выдатковацца ў вытворчасьці каля 115 тон саломы. Адны процінажарныя меры такіх складаў могуць скласьці аб'ёмісты праект.

Становішча з будаўнічымі і мантажнымі работамі можа быць ахарактарызавана наступным чынам: склады саломы, саломарэзальны аддзел, праектаў ня маюць. Няма і рабочых чарцяжоў у аддзеле абляжваньня. У аддзеле каўсьцізацыі рабочыя чарцяжы ёсьць на 50-60 проц. Няма абсталяваньня для складаў саломы і іх мэханізацыі. Напоўнасьцю забясьпечаны абсталяваньнем саломарэзальны аддзел, вычышчальны, адбельны, аддзел каўсьцізацыі і хлёрыйны. Не вядуцца мантажныя работы ў саломарэзальным аддзеле, адбельным, аддзеле абляжваньня і каўсьцізацыі. Не пачаты будаўнічыя работы на аддзелу абляжваньня і каўсьцізацыі. Ня зусім скончаны будаўніцтвам хлёрыйны аддзел, нядаўна пачат адбельны, заканчваецца вычышчальны і рэгенэрацыйны. Скончаны будаўнічыя работы толькі варачнага аддзелу. Для складу саломы яшчэ зусім ня вызначана месца пабудовы.

Мы не закранаем у гэтым артыкуле правільнасьці выбару вытворчага абсталяваньня і рацыянальнасьці плянаваньня яго ўстаноўкі, а таксама прычын затрыманьня будоўлі ў мінулым, хаця паміж будаўніцтвам і вытворчасьцю вялікія разгалоўсьці ў гэтай частцы. Мы канстатуем, што становішча новага саламяна-цэлюлёзнага заводу на сёнешні дзень, на базе наяўнага абсталяваньня пры паказанай вышэй наяўнасьці праектаў выклікае трывогу.

Варачны і ачышчальны аддзелы, мантаж якіх заканчваецца, ня змогуць быць у бліжэйшы час скарыстаны нават часткова, бо па-першае: падрыхтоўчы саламяна-рэзальны аддзел не прыстасаваны для іх абслугоўваньня, а па-другое, звараная маса ня можа быць апрацавана ў адбелачным аддзеле, які толькі пачаты будоўляй.

Веснавы і летні будаўнічыя сэзоны сарваны на ўсё 100 проц., хаця па заяве аддзелу забясьпячэньня фабрыкі асноўнымі будаўнічымі матар'ямі будоўля забясьпечвалася больш ці меньш здавальняюча.

На спэцыяльнай тэхнічнай нарадзе пры абноўленай дырэкцыі фабрыкі высьветлілася, што і ў далейшым ня можа быць зрыву работ з-за будматар'ялаў. І ўсё-ж прыходзіцца канстатаваць, што будоўля замерла.

На чале будаўніцтва няма кампетэнтных, вопытных работнікаў, адказных—адзін за мантаж, другі—за будаўнічыя работы. Галоўны інжынэр будаўніцтва—вельмі добры інжынэр і мэханік і канструктар—па сутнасьці зьяўляецца галоўным кансультантам, але адміністрацыйна-тэхнічнае кіраўніцтва з яго боку адсутнічае.

На новым будаўніцтве няма плану, няма кантрасьцаў. Рабочая сіла і матар'ялы скарыстоўваюцца няправільна. На будаўніцтве палкам і поўнасьцю адсутнічае адзінаначальне і адказнасьць за выкананьне даручаных вытворчых работ. Абязьлічка і ўраўніпаўка ў частцы безадказнасьці,—вось што характарызуе новае будаўніцтва Добрускай фабрыкі ў сучасны момант.

Вялікая доля

# ШТОРМ КЛЯСАВАГА ГНЕВУ

## МІЛЬЕНЫ ПРАЦОУНЫХ ПРАТЭСТУЮЦЬ СУПРОЦЬ КРЫВАВАГА РАЗГУЛ ФАШЫСЦКІХ АПРЫЧНІКАУ

Год выданьня—XV
№ 232 (4137)
ЧАЦЬВЕР 27 ЖНІЎНЯ 1931
Цана нумэра 6 кап.
выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

# Зьвязда

Орган ЦК Мсн. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА МЕНСК, ЗАБЕЦКАЯ, 65. Тэлефоны: редактар—2-74, сакратар—10-74, партсэктар—13-60, прамысл.—3-80, сял. гасп.—6-19, мясц. інфарм.—6-17, замеж. інфарм.—6-19, навук. рэдактар—6-42, міжнародны інфарм.—7-81, рэдакцыйны—10-74, бухгалтэрыя—7-81, рэдакцыйны—7-81.

### НА ОРГІЮ СЯРЭДНЯВЕЧНАГА ТЭРОРУ У ЗАСЬЦЕНКАХ БЕЛАПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ

## працоўныя БССР адказваюць

### масавым зборам сродкаў на дапамогу палітэзьняволеным, узмацненьнем тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва

Коціцца магутная лавіна гневу і абурэньня супроць барбаскіх катаваньняў лепшых прадстаўнікоў пралетарыяту і працоўнага сялянства Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны ў турмах белапольскай Польшчы. Сёньня няма калгасу або саўгасу і вёскі няма таго глухога кутка ў БССР, дзе-б не адбываліся бурныя мітынгі пратэсту супроць зьверства фашысцкіх катаў. Усюды працоўныя масы на барбарыстыя азьвярэлай паліцэйшчыны адказваюць масавым зборам сродкаў на дапамогу сваім зарубежным братом, што пакутуюць у засьценках белапанскай Польшчы. Рэдакцыю гасьпадоць лістамі і рэзалюцыямі пратэсту з усіх канцоў БССР.

— Клясавая сьвядомасьць пралетарскай салідарнасьці — пішуць у сваёй рэзалюцыі пратэсту замежныя рабочыя і палітэмігранты, якія працуюць у БССР, —не дазваляе нам маўчаць супроць разгулу белага тэрору ў фашысцкай Польшчы. Мы, замежныя рабочыя і палітэмігранты, ня можам быць раўнадушнымі, калі справа ідзе аб тым, што нашым братом па клясе і ідэі пагражае ў засьценках панскай Польшчы фізычнае зьнішчэньне.

Мільёны пратэстуюць. Мы лічым сваім абавязкам далучыцца да гэтага магутнага голасу пратэсту.

Мільёны патрабуюць безадкладнага спыненьня крывавых катаваньняў і зьдзекаў над працоўнымі і палітзьняволенымі у «культурнай» і «цывілізаванай» Польшчы. Мы сьведкі іахвяры капіталістычнай эксплёатацыі і фашысцкага тэрору ўчора — а сёньня сьведкі і актыўныя ўдзельнікі пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, патрабуем ад фашысцкага ўраду Польшчы безадкладнага спыненьня фізычнага зьнішчэньня лепшых сыноў працоўнага народу, лепшых барацьбітоў рэвалюцыі.

Мы папамінаем нашым братом на клясе, што турма, тэрор, дубінка і біяўката не дапамогуць. Мы заклікаем іх яшчэ больш інтэнсыўна працягваць гераічную барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Мы заяўляем ім:

**Вы не адны. З вамі ўвесь міжнародны пралетарыят, усё лепшае чалавецтва, з вамі ў першую чаргу ўдарная брыгада сусьветнага пралетарыяту — Савецкі Саюз, у тым ліку і мы—замежныя рабочыя і палітэмігранты, якія ганарацца сваім удзелам у сацыялістычным будаўніцтве».**

У адказ на крывавы тэрор разьюшнай паліцэйшчыны ў Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіне, у адказ на крывавыя оргіі фашысцкіх катаў, мы ўсе сілы і веды свае аддамо справе завяршэньня пабудовы сацыялістычнай эканомікі ў краіне дыктатуры пралетарыяту.

Мы заклікаем працоўныя масы і працоўную інтэлігенцыю ўсіх краін выступіць у абаронуахвяр фашысцкай дыктатуры Польшчы.

Мы верым у сілу інтэрнацыянальнай салідарнасьці і таму ня супакоімся дадуль, пакуль фашысцкія каты ня спыняць крывавыя расправы і зьдзекі над гераічнымі змагарамі за лепшую будучыню ўсяго чалавецтва.

Прэч рэжым Пілсудзкага — рэжым беспрацоўя, голаду тэрору вайны!

Прэч фашысцкі турэмны рэгламэнт!

Няхай жыве КПП, КПЗБ і КПЗУ!

Няхай жыве падпольная МОПР'аўская арганізацыя Польшчы!

Няхай жыве рэвалюцыйна - вызваленчы рух працоўных мас Зах. Беларусі і Зах. Украіны!

4.000 мітынг рабочых і служачых шэйнага гіганта «Сьцяг індустрыялізацыі» ў Віцебску з абурэньнем кляйміць разьюшаную польскую паліцэйшчыну, якая вядзе паход за фізычнае зьнішчэньне 10.000 рэвалюцыйных барацьбітоў—палонькікаў капіталу.

4.000 калектыў у адказ на белы тэрор абавязуецца сабраць замест кантрольных пічбаў у 3.500 руб.—4.500 руб. у фонд зімовай дапамогі барацьбітам рэвалюцыі і іх сем'ям.

— Агульны сход калгасьнікаў і аднаасобнікаў в. Асані, Бягомльскага раёну, выносячы рэзалюцыю пратэсту супроць белага тэрору ў турмах фашысцкай Польшчы, адначасова ўносіць у фонд дапамогі палітзьняволеным 25 руб. 68 к.

— Пралетары мэблевай фабрыкі і заводу «Зьвязда» у Магілеве шлюць праклацьце фашысцкім апрычнікам. Рабочыя зьвяртаюцца з заклікам да працоўных мас фашысцкай Польшчы—цясьней аб'яднацца пад сьцягамі кампартыі для канчатковага магутнага ўдару па фашысцкай дыктатуры. Вышэй сьцяг рэвалюцыйнай барацьбы! Вы не адны! Пралетары ўсяго сьвету з вамі.

Пралетары заводу «Зьвязда» на дапамогу палонькікам капіталу ўносяць пэўдзённы заработак, а пралетары мэблевай фабрыкі—двухгадзінны заработак.

**

— Фашысцкія каты, абшарнікі, капіталісты, ППС'аўцы, беларускія нацдэмы—Астроўскія, Луцкевічы! ня спыніць вам бурнай хвалі рэвалюцыйнага руху рабочых і сялян, Зах. Беларусі і Зах. Украіны, — заяўляюць у рэзалюцыі пратэсту асьветнікі Гомельскага раёну.

Таварышы, рабочыя і працоўныя сяляне Польшчы Зах. Беларусі і Зах. Украіны, змагайцеся, не шкадуючы сіл, за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне, за дыктатуру пралетарыяту. Трымайце моцна і высока сьцяг пралетарскай рэвалюцыі і памятайце, што мы, асьветнікі, як і ўсе працоўныя СССР з вамі і за вас аддамо ўсе сілы.

У адказ на шапёны фашысцкі тэрор уносім 300 руб. у дапамогу палонькім фашызму і абвяшчаем слабе ўдарнікамі па выкананьні гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы.

Канфэрэнцыя асьветнікаў Асіповіцкага раёну пастанавіла сабраць 3.000 руб. у кампанію зімовай дапамогі палітзьняволеным. Тут-жа на канфэрэнцыі на падпісным лісьце сабрана 114 руб. Збор сродкаў працягваецца.

Канфэрэнцыя выклікае на сацпаборніцтва па зборы сродкаў палітзьняволеным фашысцкай Польшчы, асьветнікаў Клічаўскага Бабруйскага і Пухавіцкага раёнаў.

Прэч белы тэрор!

Прэч фашысцкую дыктатуру ў Польшчы!

Няхай жыве кампартыя Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны!

**

**Працоўныя Лёзьняншчыны далучаюць свой голас да магутнай хвалі пратэсту, якая пракацілася па ўсіх кутках БССР супроць разгулу белага тэрору і зьдзекаў польскага фашызму над рабочымі і сялянамі Польшчы.**

**Працоўныя адлічваюць 3 проц. месячнай пэнсіі на дапамогу палітзьняволеным і іх сем'ям.**

**— Курсанты курсаў прапагандыстаў—26 чал. адлічваюць аднадзённы заработак у суме 101 руб. 50 кап. у карысьць палонькікаў капіталу і іх сем'яў.**

## Пралетарская моладзь, на барацьбу за хлеб, за свабоду і зарплату!

### Адозва Камуністычнага Інтэрнацыяналу моладзі да міжнароднага юнацкага дня

МАСКВА, 25. КАМУНІСТЫЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ МОЛАДЗІ заклікае рэвалюцыйную моладзь усяго сьвету выступіць 6-га верасьня ў 17-ты міжнародны юнацкі дзень. Верныя завету Леніна і Лібкнэхта, выконваючы задачы, ускладзеныя на моладыя пакаленьні пралетарыяту, клясавая - сьвядомая працоўная моладзь усіх рас і нацый выступіць у гэты 17-ты міжнародны юнацкі дзень і будзе дэманстраваць сваю гатоўнасьць да штурму цытадэляй капіталістычнай сыстэмы.

На чале з Карлам Лібкнэхтам 16 год назад рэвалюцыйная моладзь папаючы юнацкім балвым натхненьнем, наперакор здрадніцтву сацыял - дэмакратычных прадаўроў, сьвяткавала першы міжнародны юнацкі дзень, як дзень барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны, за яе рэвалюцыйнае ператварэньне ў вайну грамадзянскую. Зараз рэвалюцыйная моладзь змагаецца, пад кіраўніцтвам Камуністычнага Інтэрнацыяналу, які вядзе працоўныя масы да рашаючых баёў супроць небясьпекі імпэрыялістычных войн, супроць фашызму, голаду і галечы.

Савецкі Саюз уступіў у першую фазу сацыялізму. Ён паказвае юнацкім масам што рэвуцца ў бой, шлях адзінага пралетарскага выхаду з крызісу і няшчасьцяў. Прыклад пераможнага руху сацыялізму ў СССР і гераізм савецкай моладзі прымушаюць мацней біцца сэрцы моладзі, якія рвуцца да свабоды ў капіталістычных і калёніяльных краінах. Запасьпівая мужнасьцю і натхненьнем моладзь зьяўляецца дапамогаю ў барацьбе з праклятай капіталістычнай сыстэмай. У час рэвалюцыйнага ўздыму ва ўсім сьвеце, які мы зараз перажываем, у час гіганцкага пераможнага руху сацыялізму ў СССР і надыходзячых рэвалюцый у Нямеччыне і ў Польшчы, працоўная моладзь ідзе пад сьцягам тэй партыі, якая ва ўсіх краінах, сярод усіх рас і нацый арганізуе барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне рабочай клясы і ўсіх працоўных.

Пралетары ўсяго сьвету! Мабілізуйце працоўную моладзь, моладзь якая ўдзельнічала ў імпэрыялістычнай вайне, супроць капіталістычнай сыстэмы, што ідзе да катастрофы. Адчыняйце вочы моладзі, якая знаходзіцца ў рэфармісцкіх прафсаюзах, на здрадніцтва сацыял - дэмакратычных і буржуазных прадаўроў і ўцягвайце яе ў рады рэвалюцыйных прафсаюзаў.

17-ты міжнародны юнацкі дзень, дзень самай цеснай баявой змычкі з дарослымі пралетарамі, павінен стаць днём стварэньня згуртаванага росту ўсіх працоўных супроць падрыхтоўкі ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР, СУПРОЦЬ СПРОБЫ СУСЬВЕТНАЙ БУРЖУАЗІІ РАЗГРАМІЦЬ КІТАЙСКУЮ, НЯМЕЦКУЮ І ПОЛЬСКУЮ РЭВАЛЮЦЫІ. У 17-ты міжнародны юнацкі дзень свабодная працоўная моладзь СССР з новым прылівам творчай энэргіі яшчэ больш уключыцца ў сацыялістычнае будаўніцтва і выкарыстае гэты дзень для далейшага ўмацаваньня пераможнага ленінскага камсамолу.

Камуністычны Інтэрнацыянал, праз камуністычны Інтэрнацыянал моладзі вядзе рэвалюцыйную моладзь у бой за работу, за хлеб, за зямлю, свабоду і ўладу, за перамогу камунізму!

## На пленуме ЦСПСБ

25-га жніўня адкрыўся чарговы пленум ЦСПСБ з удзелам усіх старшынь Райпрафсаветаў і 6-ці больш буйных фабрычна-заводзкіх камітэтаў. На вячэрнім і раніцкім пасяджэньні 26-га пленум заслухаў даклад т. Валасевіча аб выкананьні прамфінпляну за першае паўгодзьдзе па прадпрыемствах ВСНГ і т. Зайцава — па прадпрыемствах Наркамснабу і садаклад тав. Каменштэйна аб сацпаборніцтве і ўдарніцтве.

Прафсаюзныя арганізацыі не ў выстарчальнай меры мабілізавалі масы рабочых на барацьбу за плян. Лепшай сьведкай гэтаму зьяўляецца завод імя Сталіна (Магілёў) які ўвесь час не давыконваў прамфінпляну, а ў апошні час, пасьля таго, як кіраўніцтва на сапраўднаму ўвялося за працу, перабудавала яе пановаму, шырока мабілізавала масы рабочых, завод ня толькі выконвае, але і перавыконвае прамфінпляны.

Дакладчыкі падкрэсьлілі неабходнасьць вынішчэньня прарываў першага паўгодзьдзя, у другім паўгодзьдзі для чаго павінна быць неадкладна перабудавана ўся работа фабрычна-заводзкіх арганізацый, выходзячы з новых умоў гаспадарчага будаўніцтва. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва — асноўны сродак штодзённай барацьбы за бальшэвіцкія тэмпы павінна атрымаць больш канкрэтнае, жывое, аперацыйнае кіраўніцтва з боку прафсаюзаў.

Дакладчыкі адзначылі неабходнасьць шырокага прыцягненьня мас для складаньня кантрольных пічбаў на 4 год пяцігодкі.

Учора раніцнае і вячэрняе пасяджэньні былі прысьвечаны спрэчкамі па пералічаных вышэй дакладах. У спрэчках паказалася, што рабочыя заводу «Пралетары» (Гомель) высунулі сустрэчны плян на 20% вышэй устаноўленага Белмоталеб'яднаньнем, аднак апошні адказуе выдаць дадатковы сырэц, прапанаваўшы выконваць дадзены ім плян.

Выступаўшыя (тав. Драбінскі, Белонькі і інш.) асаблівую ўвагу зварталі на пытаньні сацыяльна-бытавога і культурнага абслугоўваньня членаў прафсаюзаў. Гэтыя пытаньні яшчэ не занялі таго месца ў рабоце прафарганізацый, якое ім належыць. Характэрна, што калі брыгада аховы здароўя зьвярнулася ў Магілёўскі Райпрафсавет за дапамогай у наладжваньні санітарнага становішча на заводах Райпрафсавет адказаў, што... гэта не яго справа.

Н. Н.

## Фашысцкая Польшча— краіна беспрацоўя

ВАРШАВА, 23. Беспрацоўе ў фашысцкай Польшчы, наперакор запэўненьням афіцыяльных эканамістаў, УЗРАСТАЕ З КОЖНЫМ ДНЕМ. Паводле ўрадавых даных, колькасьць беспрацоўных на 8 жніўня дасягнула лічбы Ў 255.887 АСОБ. Колькасьць беспрацоўных па асобных прафэсіях: гарнякоў — 13.587, мэталістаў — 21.802, тэкстыльшчыкаў — 23.737, будаўнікоў — 17.435, ліцэйшчыкаў — 2.537, рабочых гут — 2.821, служачых — 30.499.

На агульную лічбу — 255.887 беспрацоўных у Польшчы, беспрацоўных кваліфікаваных налічваецца 122.798 АСОБ. Колькасьць часткова беспрацоўных на 8 жніўня раўнялася 119.510 ЧАЛАВЕК, з якіх АДЗІН ДЗЕНЬ НА ТЫДЗЕНЬ працавала 4.904 чалавекі, 2 ДНІ — 10.980, ТРЫ ДНІ — 34.973, 4 ДНІ — 37.862, 5 ДЗЕН — 31.371 чал. З гэтай вялізарнай колькасьці беспрацоўных, паводле фашысцкай «ГАЗЭТЫ ВАРШАЎСКАЙ», ДАПАМОГУ АТРЫМЛІВАЕ ТОЛЬКІ 71.030 БЕСПРАЦОЎНЫХ.

З буйных прамысловых цэнтраў Польшчы асабліва МОЦНА ЗАКРАНУТЫ БЕСПРАЦОЎЕМ ПАЗНАНСКАЕ І ПАМОРСКАЕ ВАЯВОДЗТВЫ, дзе беспрацоўе на працягу году павялічылася амаль НА 100 ПРОЦАНТАЎ. Так, 2 жніўня 1930 году ў гэтых прамысловых цэнтрах налічвалася 18.744 БЕСПРАЦОЎНЫХ, а 1-га жніўня бягучага году лічба іх перавысіла 33.787 ЧАЛ. Такое самае становішча назіраецца ў ВЕРХНЯЙ СІЛЕЗІІ: калі 2-га жніўня 1930 году налічвалася там 33.646 БЕСПРАЦОЎНЫХ, дык праз год лічба іх павялічылася да 60.468 ЧАЛ.

Эканамічны крызіс у бягучым годзе набыў настолькі катастрафічныя памеры, што вясновы сэзон, які ў мінулым гады значна зьніжаў беспрацоўе, у гэтым годзе АМАЛЬ ЗУСІМ НЯ ПРЫНЁС ПАЛЯГЧЭНЬНЯ.

У САСНОЎЦЫ І БЕЛАСТОКУ беспрацоўе, у параўнаньні з мінулым годам павялічылася больш, чым на 50 ПРОЦ. У ТАКІХ САМЫХ ПРОЦАНТНЫХ АДНОСІНАХ УЗРАСЛО БЕСПРАЦОЎЕ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ І ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЕ. Вось малюнак беспрацоўя ў фашысцкай Польшчы паводле буржуазнага друку.

## Скад ангельскага ўраду

ЛЕНДАН, 25. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: «Новы габінэт сфармаваны ў наступным складзе: прэм'ер - Макдональд, старшыня рады—лёрд Балдуін, міністар фінансаў — Снёўдэн, міністар унутраных спраў — Самуэль, міністар замежных спраў — лёрд Рыдзінг, міністар па справах Індыі—Хор, міністар па справах трэд-юніёнаў і калёній—Томас, міністар аховы здароўя — Нэвіль Чэмбэрлен, міністар гандлю — Лістэр».

Апрача гэтага наступныя асобы ўвайшлі ў склад новага ўраду, не зьяўляючыся членамі габінэту: міністар авіяцыі — Эмэры, марскі міністар Осьцін Чэмбэрлен, міністар па справах Шатляндыі — Сінклер, міністар асьветы — Мэнпін, міністар працы —Гэтэрсон, міністар па справах гэрцогства Ланкаширскага маркіз Доціён. Хто заняў пасты ваеннага міністара і міністара зямляроблства пакуль невядома.

## ГАЛАДОЎКА ПАЛІТЗЬНЯВО... У ГОРАДНІ ЗАДУШАНА ПА... І ЖАНДАРМЭРЫЯЙ...

## ПАД УДАРАМІ ЖАЛ... ШТАБЫ—КРОЎ ХЛЬ... НОСАМ І ГОРЛА...

### „Калі мы трацілі пр... насьць, дык нас адл... вадою, каб катаваць д...

ВАРШАВА. У барацьбе супроць рэвалюцыйнага і нац... ленчага руху працоўных мас Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. ... фашызм ня спыняецца ні перад чым. Правакацыі, подкупы, ... ты, катаваньні па дэфэнзывах, турмах, забойствы — усе пуск... толькі дасягнуць сваёй мэты. Асабліва часта фашысцкія дэ... таюцца да свайго ўлюбёнага мэтаду—да правакацыі. Прэса ... фашыстаў падае наступны выпадак:

— Да рабочага Фрайліхмана ў ЗВАЛЕНЮ зайшоў тайны ... і няпрыкметна палажыў на шафе нелегальную адозву, на яко... напісана некалькі прозьвішчаў рабочых гэтага мястэчка. Гэта... вая дачка Фрайліхмана, якая не разумела чым гэта пагражае ... кому дома аб гэтым не сказала.

Праз некаторы час зайшоў вядомы ў павеце кат дэфэнз... ПОЎСКІ і «знайшоў» гэту падкінутую адозву. Адразу-ж пачал... ўсіх запісаных на адозве рабочых. Аднаго з іх Х. Фуха затры... і заявілі на пастарунак паліцыі разам з Фрайліхманам. ТАМ ... РУКІ І НОГІ І БІЛІ ДА СТРАТЫ ПРЫТОМНАСЬЦІ. АСАБЛІ... НАЧАЛЬНІК ДЭФЭНЗЫВЫ СТЭМПОЎСКІ, ЗЬБІВАЮЧЫ АР... ГУМОВЫМІ ПАЛКАМІ І ЖАЛЕЗНАЙ ШТАБАЙ. КАЛІ КАТ... ЦІЛІ ПРЫТОМНАСЬЦЬ, ДЫК ІХ АДЛІ ВАЛІ ВАДОЙ КАБ КА... ЛЕЙ. У ТАВАРЫША ФУХА АД КАТАВАНЬНЯЎ КРОЎ ПАЙ... РОТАМ. Напоўмёртвага ад страты крыві дэфэнзыўныя каты ... Казеніцы. У Казеніцах, выкліканы свайкамі Фуха доктар Абра... ДАПУШЧАНЫ ПАЛІЦЫЯЙ ДА ХВОРАГА. Аднак від чалаве... прытомнасьць і ляжаў у лужы крыві і да таго яшчэ зьвязаны... чаў на доктара, што той зьвярнуўся да камісара паліцыі, аб ... ны параненаму, але яму было адмоўлена ў гэтым. На другі д... перавезен у Казеніцкую турму, дзе ЯГО НЯПРЫТОМНАГА ПА... ЗАМ З ПРАФСЭСЫЯНАЛЬНЫМІ ЗЛОДЗЕЯМІ І БАНДЫТАМІ, ... па 10-15 год катаргі. Нікога да ерыштаванага не дапусьцілі, по... правоў.

Звяленіцкая расправа — ГЭТА ТОЛЬКІ КРОПЛЯ ... ШТО АДБЫВАЕЦЦА ШТОДНЯ, КОЖНУЮ ГАДЗІНУ ПА УСЕ...

## Расправа над палітзьн... ленымі ў Горадні...

БЭРЛІН, 26. З ВАРШАВЫ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ ПАДРАБЯ... ГАЛАДОЎЦЫ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ У ГОРАДЗЕНСКАЙ ТУРМ... ДЗЕНЬ ГАЛАДОЎКІ Ў ТУРМУ БЫЛА ЎВЕДЗЕНА ПАЛІЦЫЯ І ... РЫЯ, ЯКАЯ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ САМОГА НАЧАЛЬНІКА ... ДЗІЛА КРЫВАВУЮ ЛАЗЬНЮ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫМ. (ТАСС).

## Подлая правакацыя бэрлін... паліцыі

БЭРЛІН. ЦК нямецкай кампартыі апублікаваў заяву з прычы... ных у апошнія дні буржуазнай прэсаю выдумак аб выкрыцьці п... даў зброі, якія нібы належалі кампартыі.

У заяве гаворыцца, што цьвердженьні нібы ў часе вобыску ... па Лібкнэхта (дом ЦК кампартыі) былі знойдзены «У тайным пад... раванным вдрасы, на аснове якіх былі выкрыты склады зброі, ЯУ... КА: У ЧАСЕ ЎСІХ ВОБЫСКАЎ У ДОМЕ КАРЛА ЛІБКНЭХТА, ... апошні вобыск, НІЧОГА НЯ БЫЛО КАНФІСКАВАНА, АКРАМЯ СТ... ЛЯТУРЫ.

УСЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ, ЯКІЯ СЬЦЬВЯРДЖАЮЦЬ АДВАР... ЛЯЮЦЦА СЬВЯДОМАЙ ХЛУСЬНЕЙ.

У заяве ЦК спыняецца таксама і на паведамленьні «Форвэр... карыстаў выкрыцьцё складу зброі на Тыльзіцкай вуліцы ў Бэрл... каб абвінаваціць камуністаў у арганізацыі замаху на цягнік у Ю...

УЖО АДЗІН ТОЙ ФАКТ, ШТО Ў ЦЯГНІКУ, НА ЯКІ БЫЎ ... ЗАМАХ, ЗНАХОДЗІЎСЯ КАМУНІСТЫЧНЫ ДЭПУТАТ РЭЙХСТАГ... НЕН, ДАКАЗВАЕ ЎСЮ БЯЗГЛУЗЬДЗІЦУ ЦЬВЕРДЖАНЬНЯЎ «Ф...

У заключэньні заявы ўказваецца, што ўсе гэтыя хлусьліва... весткі служаць толькі мэце ДАБІЦЦА ЗАБАРОНЫ КАМПАРТЫ... САБЕ ЗАДАЧАЙ АДЦЯГВАНЬНЕ ЎВАГІ НЯМЕЦКАГА НАРОДУ ... ГА СТАНОВІШЧА, У ЯКІМ ЁН ЗНАХОДЗІЦЦА.

Адказны рэдактар—С. Б...

„Чырвоная Зорка" — ШПАРКАСЬЦЬ І НАЦІСК. Пач. у 7; 8-45; 10-30. Камэдыя ў 8 частках. ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ТРЫМАЙ ЗЛОДЗЕЯ.

„КУЛЬТУРА" — Новы выдатны мастацкі бытавы фільм 2 МАТКІ 2. Пач. у 6; 8-45. драма ў 6 частках.

„Пралетары" — Мастацкі фільм ПРАКАЖОНАЯ. Адкр. з 12 г. дня. драма ў 6 частках.

„Інтэрнацыянал" — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ПАЎНОЧНАЕ НАХАНЬНЕ. Пач. і с. у 7 ч. в. драма ў 7 части. Звыш прагр. кіно-часоп. БДИ № 14.

„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — С 22 жніўня САВУР МАГІЛА. Пачатак з 1 г. дня

„СПАРТАК" — Пач. 6-30, 8-30 і 11. Каса—з 6 гадз. Ігар Ільінскі у карціне ЛЯЛЬКА З МІЛЬЁНАМІ. Камэдыя ў 6 частках

Даводзіцца да ведама ўсіх паступаючых ва Ўсебеларускую Саўпартшколу, што прыймовыя іспыты пачнуцца з 1-га кастрычніка 31 г.
Усе таварышы, якія атрымалі паведамленьні аб дапушчэньні да прыймовых іспытаў, павінны прыехаць ў Саўпартшколу (Гомель, парк імя Луначарскага) 1-га кастрычніка.
Нам. Загадчыка Саўпартшколы Кулінаў.

СТУДЭНТЫ УСІХ КУРСАЎ Беларускага Дзяржаўнага Фінансава-Эканамічнага Інстытуту ПАВІННЫ ЗЬЯВІЦЦА ПА ЗАНЯТКІ 1-га верасьня ў 8 гадз. раніцы. ДЫРЭКЦЫЯ.

ПРЫ БЕЛ. ТОРФ. ІНСТЫТУЦЕ АДКРЫВАЮЦЦА падрыхтоўчыя 3-месячныя КУРСЫ на 60 асоб. Прымаюцца з адукацыяй 6 гр. семігодкі, іншыя трымаюць іспыты. Прымаюцца рабочыя, дзеці рабочых і калгасьнікаў вузта. стажам ня менш 3-год. Патрэбна прадстаўленьне дакументаў, згодна агульных правіл прыёму.

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" звяніце па тэл. 7-81

МЕЙДНАЯ музычная школа ПРАЦЯГВАЕ прыём заяў да 1 верасьня.

Беларускі інстытут спатканьняцкай кампэтэнцыі паведамляе, што прыём заяў на асобны курс інстытуту працягнут да 5 верасьня. Умовы прыёму абвешчаны ў газ. „Зьвязда" ад 25-VII-31 г. Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасе: г. Менск Беларускаяка, сьвятар кадраў. Дырэкцыя інстытуту.

Т-ва Садзейнічаньня Рацыяналізацыі Вучоту („ОРУ") АРГАНІЗУЕ КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ РАХУНКАВОДАЎ для ўстаноў і прадпрыемстваў г. Менску і для раёнаў.
Слухачы раённай групы забясьпечваюцца стыпендыяй 60 руб. у месяц (квартэрні не забясьпечваюцца).
Слухачы гарадзкой групы навучаюцца дармова.
Тэрмін навучаньня ад 3 да 6 месяцаў.
Заявы прымаюцца ў канцылярыі „ОРУ" (Савецкая, 55, уваход з варот, тэл. № 11-99) ад 10 да 12 гадз. дня да 15 верасьня.
Да заявы неабходна дадаць наступныя дакументы: аб сацыяльным становішчы, аб праве голасу, аб узросце (ня менш 17 год) і аб асьвеце (ня ніжэй 5 груп).
Калгасьнікі павінны прадставіць згоду свайго праўленьня.

Беларускі дзяржаўны Унівэрсытэт і вышэйшы пэдагагічны інстытут паведамляюць усіх студэнтаў, што ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ ЯК У БДУ, ТАК І ПЭДІНСТЫТУЦЕ адбудзецца з 1 верасьня г. г., а таму ўсе студэнты павінны быць да гэтага часу ў Менску.
Студэнты, якія не зьявяцца своячасова на заняткі, будуць выключаны з ліку студэнтаў. Заняткі на студэнтамі, якія будуць злічаны ў асеньні прыём гэтага году, пачнуцца з 1 кастрычніка.

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакумэнту 1 р.

Бюро ІТР і калектыў ЛКСМБ Дзяржпляну АРГАНІЗУЮЦЬ СЫСТЭМАТЫЧНУЮ КАНСУЛЬТАЦЫЮ для плянава-апэрацыйных груп БССР. Кансультацыя пачнецца 28 жніўня 1931 г. ДЗЯЖУРСТВЫ будуць праводзіцца па чотных лічбах ад 18 да 20 гадзін.
Па ўсіх пытаньнях працы плянава-апэрацыйных груп, як у вусных, так і ў пісьмовай форме зварачацца ў Дзяржплан БССР—Менск, пляц Волі № 8, пакой № 6.
Бюро ІТР і бюро калектыву ЛКСМБ Дзяржпляну.

28-га ЖНІЎНЯ, у 8 гадзін. раніцы Гарпрафсавет, сумесна с рэдакцыяй „Рабочий" склікае нараду старшынь ФЗМК гораду, )—( па пытаньнях: )—(
1) ход праверкі калдагавору,
2) аб уборцы ў прыгарадных гаспадарках.
Яўка павінна быць своячасовая і абавязковая.
Гарпрафсавет і рэдакцыя „РАБОЧИЙ".

АСОАВІЯХІМ—апора мірнай працы і абароны СССР
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ўтварыць падарожжа вакол сьвету
„ „ „ мець легкавы аўтамабіль
„ „ „ адпачыць на лепшым курорце СССР
„ „ „ выграць сотні тысяч каштоўных выйгрышаў: камбайн, гатункавага каня, маторныя лодкі, швэйныя машыны, вэлёсыпэды, стрэльбы, срэбныя партсыгары, гадзіньнікі, гарнітуры с.г. машын і рад іншых выйгрышаў,—
НАБЫВАЙЦЕ білеты 8, 9 і 10 разряд
5-й ЎСЕСАЮЗНАЙ ЛЁТАРЭІ АСОАВІЯХІМУ
у ячэйках Асоавіяхіму, Дзяржбанку і Ашчадкасах.
АПОШНІЯ ТЫРАЖЫ адбудуцца ў жніўні і верасьні м-цах 1931 г. у Маскве, Ленінградзе і Растове на Дану.
У сярэднім адзін выйгрыш падае на 75 білетаў.
Цана білета—1 рубель.
15.000.000 рэалізаваных білетаў 8, 9 і 10 разрядаў дадуць 15.000.000 рублёў НА АБАРОНУ КРАІНЫ.
Памятай, што твой удзел у 5-й лётарэі зьяўляецца ўкладам у справу абароны СССР!

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ ва Ўсебеларускі палітыка-асьветны інс... на 1931-32 НАВ. ГОД
Палітыка-асьветны інстытут мае мэту падрыхтаваць палітасв... паўнікоў з вышэйшай кваліфікацыяй па асобных галінах пал... працы.
У адпаведнасьці з гэтым ПРЫ ІНСТЫТУЦЕ ІСНУЮЦЬ СПЭЦ... АДДЗЯЛЕНЬНІ 1) Арганізацыйна-інструктарскае. 2) Бібліятэчнае. ... палітыка-асьветнай працы.
На 1-шы курс бяз іспытаў прымаюцца асобы, скончыўшыя ку... рыхтоўцы ў ВНУ, ВТНУ, тэхнікумы, 9-годкі, ФЗВ і інш. раўналяг... вучальныя ўстановы. Усе іншыя павінны трымаць іспыты ў аб'ёме ... рэдняй школы.
У палітыка-асьветны інстытут на аддзяленьні арганізацыйна-... скае і масавай палітыка-асьветнай работы прымаюцца партыйцы і ... цы, якія маюць ня менш, як 2-гадовы стаж актыўнай партыйнай, ... скай або грамадзкай працы.
На бібліятэчнае аддзяленьне прымаюцца і беспартыйныя з 2-га... жам грамадзкай працы.
Узрост паступаючых ад 17—35 год.
У інстытут ня прымаюцца асобы з заразьлівымі хваробамі, хво... стэніяй у клінічнай форме, сухотамі і яўсім фізычна слабыя.
Паступаючыя ў палітыка-асьветны інстытут павінны падаць ... ённых і гарадзкіх камісій, што існуюць пры райкомах і гаркомах КП ... ву з паказаньнем аддзяленьня і далучыць наступныя дакументы: 1) ... це, 2) адносінах да вайсковай павіннасьці (адбітак), 3) аб асьвеце, ... здароўя, 5) аб сац. і матар'яльн. становішчы паступаючага і яго ... 6) аб выбарчых правах паступаючага і яго бацькоў, 7) для калгасьн... веду ад калгасу, а для аднаасобнікаў—адпаведны дакумант аб с.-... на 1931 г., 8) даведку аб 2-хгадовым практычным стажы (для асоб... шых тэхнікумы і прафшколы), 9) характарыстыку мясцовай партыйн... самольскай ячэйкі, 10) анкету, засьведчаную савецкімі або праф. ус... арганізацыямі раённага маштабу, 11) дзьве фота-карткі і на 30 кап. ... марак для адказу. Дакументы аб асьвеце дасылаюцца толькі ў ... форма анкеты там-ж, як і для ўсіх вышэйшых навучальных устаноў.
Праца адборачных камісій пры райкомах і гаркомах КП(б)В павін... скончана да 1 верасьня. Сьпісы камандыраваных з усімі дакумантам... юцца райкомамі і гаркомамі КП(б)В палітыка-асьветнаму інстытуту н... чым да 10 верасьня на адрасе: г. Магілеў, к-Д., Камсамольская, 28.
З 15 па 20 верасьня праводзяцца іспыты.
Усе залічаныя студэнты інстытуту забясьпечваюцца інтэрнатам... дыяй, насьпельнай бялізнай, падручнікамі і пісьмовымі прыладамі.
Інстытут не бярэ на сябе ніякіх абавязацельстваў па прадас... кватэр сем'ям студэнтаў.
Для канчатковага залічэньня студэнтаў пры інстытуце ўтвараю... сія.
Прыём на 1-шы курс інстытуту ўстанаўляецца ў ліку 60 асоб.
Райкомы і гаркомы КП(б)В камандыруюць вышэй нормы для пе... бору: Менскі, Віцебскі, Гомельскі—ня менш, як 4 асобы, Магілеўскі, ... Шклоўскі, Рэчыцкі, Бабруйскі, Жлобінскі—ня менш як па 3 асобы, ... астатнія раёны—ня менш, як па 2 асобы, і ня менш як па 3 асобы.
Заняткі па першым курсе інстыту...
Студэнты 2-га курсу інстытуту (б. палітасьветнае аддзяленьне ... вінны зьявіцца на заняткі 15 верасьня.
Дырэктар П. КАПАЛ...

Менск, друкарня «Зьвязды».

Замоўлітбел № 